ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 76 (2242)
24 верасня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

УПЕРШЫНЮ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА

АДКРЫТА ТРАСА ЗЯМЛЯ—МЕСЯЦ—ЗЯМЛЯ

Савецкая навука зноў у авангардзе перадавой тэхнічнай думкі!

21 верасня ў заданым раёне акваторыі Індыйскага акіяна скончыла свой шматкіламетровы шлях праз прасторы Вялікага Космасу аўтаматычная станцыя «Зонд-5». Створаная геніем савецкага чалавека, станцыя «Зонд-5» упершыню ў гісторыі чалавецтва абляцела вакол Месяца і шчасліва вярнулася на зямлю.

Упершыню ў гісторыі чалавецтва... Колькі разоў пасля гэтых слоў мы дадавалі — савецкі. Першы савецкі спадарожнік. Першы атамны ледакол. Першы чалавек у космасе... Ды хіба пералічыш усё, што ўвайшло ў скарбніцу тэхнічных, навуковых, мастацкіх дасягненняў чалавецтва з маркай — савецкае!

І вось сёння ўсе мы, савецкія людзі, і тыя, хто здалёк са здзіўленнем і захапленнем паглядае на нас, віншуем вучоных, рабочых, інжынераў, якія распрацавалі і здзейснілі нябачны дагэтуль эксперымент.

Эксперымент, які падрыхтаваў для чалавека шлях звароту на зямлю з глыбінь касмічнай прасторы.

Эксперымент, які яшчэ раз пацвердзіў, што падарожжа да Месяца і планет—справа недалёкай будучыні.

Салістка народнага хору Дома культуры Мінскага аўтазавода Валянціна Жышкевіч.
Фота Х. ГРЫГОР'ЕВА.

УДЗЕЛЬНІКАМ СУСТРЭЧЫ САВЕЦКІХ І ЗАМЕЖНЫХ ЛІТАРАТАРАЎ У ТАШКЕНЦЕ

Горача вітаем міжнародную сустрэчу савецкіх і замежных літаратараў, якія сабраліся ў сталіцы Узбекскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі з выпадку дзесяцігоддзя першай Ташкенцкай канферэнцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі.

Глыбокая зацікаўленасць народаў у творчасці прагрэсіўных пісьменнікаў усіх краін вызначаецца выключнай важнасцю літаратуры ў агульнай вызваленчай і класавай барацьбе, у павышэнні нацыянальнай самасвядомасці шырокіх мас, у будаўніцтве новага жыцця, пры якім не можа быць месца каланіяльнаму прыгнечанню, нацыянальнай і расавай няроўнасці.

Савецкія людзі ведаюць і высока цэняць намаганні літаратараў Азіі і Афрыкі, накіраваныя на ўмацаванне згуртаванасці сваіх народаў, іх высакародную барацьбу супраць агрэсіўных падкопаў імперыялізму і яго дыверсій на ідэалагічным фронце. У сутычцы з сіламі міжнароднай рэакцыі мы не павінны аслабляць нашай энергіі ў падтрымцы справядлівай справы в'етнамскага народа, які змагаецца супраць амерыканскіх захопнікаў, арабскіх народаў, што дабіваюцца ліквідацыі вынікаў ізраільскай агрэсіі, барацьбы афрыканскіх патрыётаў супраць зверстваў расісцкіх рэжымаў.

Камуністычная партыя і ўрад Савецкага Саюза праяўляюць пастаянныя клопаты аб шматнацыянальнай сям'і савецкіх пісьменнікаў, актыўных удзельнікаў будаўніцтва камунізма ў нашай краіне, усяляк садзейнічаюць развіццю цесных літаратурных сувязей і супрацоўніцтва савецкіх пісьменнікаў з пісьменнікамі краін Азіі і Афрыкі, з усімі прагрэсіўнымі дзеячамі культуры. Прыкладам такога баявога антыімперыялістычнага згуртавання з'яўляецца, на наш погляд, прагрэсіўная дзейнасць Асацыяцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі, аснова якой была закладзена дзесяць гадоў назад на першай Ташкенцкай канферэнцыі літаратараў двух кантынентаў.

Жадаем вашай сустрэчы паспяховай работы ў інтарэсах далейшага развіцця сусветнай прагрэсіўнай літаратуры, пад знакам згуртавання дзеячоў культуры Азіі і Афрыкі на барацьбу супраць імперыялізму, за свабоду і незалежнасць народаў, за ўсеагульны мір.

Л. БРЭЖНЕЎ,
Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

А. КАСЫГІН,
Старшыня Савета Міністраў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

ВЫСОКАЯ АДКАЗНАСЦЬ ПІСЬМЕННІКА

НА ФОРУМЕ Ў ТАШКЕНЦЕ

У зале Акадэмічнага тэатра імя Хамзы ў Ташкенце 21 верасня пачаў сваю работу Міжнародны сімпозіум «Літаратура і сучасны свет».

Тут пасланцы амаль з пяцідзесяці краін. Гэта і вядомы непальскі драматург, віцэ-прэзідэнт Каралеўскай гуманітарнай акадэміі Бал Крышна Сама, паэт і перакладчык з Малі Гастон Гаусу Дзіавара, пісьменнік і багаслоў з Малі Абдулазіз Шэйх Ісмаіл, пісьменнік з Японіі Ёсіе Хотта, вядомы савецкім чытачам па аповесці «Час», раманах «Помнік» і «З глыбіні бушуючага мора», пісьменнік і вучоны, кіраўнік суданскага пурызма Абдала Эль Тайіб і вядомы індыйскі крытык, камуніст Саджад Захір, кенійскі празаік і публіцыст Джон Мванге, віднейшы ліванскі пісьменнік, выдавец і галоўны рэдактар літаратурнага часопіса «Аль Адаб» Сухель Ідрыс, шырока вядомы аўстралійскі раманіст Фрэнк Хардзі, палескінскі пісьменнік Мордэхай Аві Шаул, адзін з заснавальнікаў Лігі праў чалавека і Руху дружбы Ізраіль — СССР, старшыня Саюза пісьменнікаў Манголіі Санамын Удвал...

Пасяджэнне адкрыў старшыня Савецкага камітэта па сувязях з пісьменнікамі краін Азіі і Афрыкі Сарвар Азімаў. Прамоўца адзначыў, што, гаворачы аб узаемаадносінах літаратуры і сучаснасці, нельга не ўлічваць дзве галоўныя тэндэнцыі, якія вызначаюць асноўны напрамак развіцця мастацкага мыслення ў сённяшнім свеце. Калі прагрэсіўная літаратура арганічна звязана з жыццём, з барацьбой перадавых сіл грамадства за сацыяльны прагрэс, то літаратура рэакцыйная імкнецца адвесці чытачоў ад актуальных праблем, якія хвалююць сотні мільёнаў людзей усіх кантынентаў.

— Выкрыццё рэакцыйнай ідэалогіі, паслядоўная і глыбокая крытыка яе эстэтычных тэорый, — падкрэсліў С. Азімаў, — адна з асноўных задач сучаснасці. Без яе вырашэння не можа быць забяспечана і сапраўды свабоднае, сапраўды прадуктыўнае развіццё літаратуры і мастацтва вызваленых народаў. Будучыня нацыянальнага мастацтва і літаратуры непарыўна звязана з ідэаламі сацыяльнага прагрэсу.

Прамоўца заявіў, што мастацтва сацыялістычнага рэалізму адкрывае бязмежную прастору для развіцця стыляў, напрамкаў, школ і творчых індывідуальнасцей, што яно абапіраецца на лепшыя традыцыі нацыянальнага мастацтва.

Потым выступілі генеральны сакратар Асацыяцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі Юсэф эс Сібаі, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Віталь Озераў, пісьменнік Чынгіз Айтматаў, егіпецкі паэт Мурсі Саад эд-Дзін, малійскі паэт Гаусу Дзіавара, казахскі пісьменнік Ануар Алімжанаў, паэт з Непала Бал Крышна Сама, паўднёва-афрыканскі пісьменнік Алекс Ла Гума, галоўны рэдактар часопіса «Дружба народов» Сяргей Баруздзін, паэт з Індыі Рамбір Сінгх, грузінскі крытык Уладзімір Мачаварыані.

Юсэф эс-Сібаі вызначыў у якасці адной з галоўных задач пісьменніка яго актыўны ўдзел у барацьбе прагрэсіўных сіл супраць імперыялізму і каланіялізму, за мір і справядлівасць. У гэтай сувязі ён выказаў думку, што свабода творчасці — гэта перш за ўсё свабода ад імперыялізму і каланіялізму.

Мурсі Саад эд-Дзін і Гаусу Дзіавара падкрэслілі вядучую ролю пісьменнікаў у стварэнні новай культуры ў тых краінах, дзе раней гаспадарылі каланізатары. Мурсі Саад эд-Дзін адзначыў таксама, што бурнае развіццё навукі і тэхнікі ў сучасным свеце не павінна палохаць дзеячоў культуры. Гэта развіццё не супярэчыць духоўным каштоўнасцям, а, наадварот, памнажае іх.

— Калі я пішу ў адной са сваіх кніг, — сказаў у сваім выступленні Алекс Ла Гума, — як дзесьці ў Паўднёвай Афрыцы беднякі вымушаны купляць ваду ў мясцовага эксплуататара, я ўпотай пешчу надзею, што людзі прачытаюць мае словы і іх гнеў абрушыцца на рабаўнікоў, якія ператварылі маю краіну ў пустыню для большасці яе жыхароў. Гэтая барацьба на поўдні Афрыкі ўжо вядзецца, і мне прыемна ведаць, што я не стаю ў баку ад яе.

Сустрэча літаратараў пяці кантынентаў праходзіць у дружнай, сапраўды творчай атмасферы.

ВЫСТАЎКІ, ВЫСТАЎКІ...

АБМЕРКАВАННЕ «БЕЛАРУСЬ-ФОТА 68»

Рэспубліканская выстаўка мастацкай і дакументальнай фатаграфіі «Беларусь-фота 68», прысвечаная 50-годдзю БССР і КПБ, карыстаецца вялікай увагай гледачоў. Яе наведваюць тысячы мінчан і гасцей сталіцы. Кніга водгукаў на выстаўцы папаўняецца запісамі, якія сведчаць, што творы беларускіх майстроў фатаграфіі хвалююць сваёй тэматыкай і майстэрствам выканання.

19 верасня Саюз журналістаў БССР наладзіў абмеркаванне выстаўкі. Яно адбылося ў памяшканні Дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны, дзе размяшчаецца экспазіцыя. На абмеркаванне з'ехаліся з розных мясцін рэспублікі больш васьмідзесяці фатографаў - прафесіяналаў і аматараў — удзельнікаў гэтай выстаўкі.

Агляд экспазіцыі зрабіў член рэдкалегіі часопіса «Советское фото» І. Селязнёў. Ён высока ацаніў здымкі А. і М. Ананьіных «Уладар пушчы», А. Мызнікава «Акадэмік Сцяпанаў», Д. Прэса «А ты чаму ў футры?», «Доктар фізіка-матэматычных навук В. Платонаў». Станоўча былі ацэнены таксама работы А. Аўдзеева «Праз заслону дажджу», «На схіле дня» і В. Ждановіча «Мікраён». І. Селязнёў крытыкаваў некаторыя партрэтныя здымкі.

У шчырай, зацікаўленай размове пра творчасць прафесіяналаў і фотааматараў прынялі ўдзел М. Ананьін, У. Марцыёнка, А. Мызнікаў, А. Борчык.

Ул. ЛІСІЦЫН.

НА ЎСЕНАРОДНЫ АГЛЯД

У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрыта выстаўка твораў беларускіх мастакоў, вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1968 года.

Экспануюцца творы графікаў — лінагравюры «Смаргонь. 1905 год» і «Звязда» Л. Асецкага, серыя афортаў «Майстры» і мастацкае афармленне паэмы Я. Купалы «Курган» А. Кашкурэвіча, серыя лінагравюр «Здабытчыкі» і мастацкае афармленне паэмы Я. Коласа «Новая зямля» Г. Паплаўскага, скульптурны трыпціх «Партызаны» Л. Гумілеўскага.

Б. РАНІН.

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ АКАДЭМІЧНАЙ

У Маскве ў выставачнай зале Акадэміі мастацтваў СССР адкрыта выстаўка твораў выяўленчага мастацтва, якія акадэмія прадставіла на атрыманне Дзяржаўнай прэміі СССР 1968 года.

Экспануюцца работы вядучых майстроў савецкага выяўленчага мастацтва — графічныя серыі В. Іванова і Г. Захарава, жывапісныя творы В. Стажарава, Т. Салахава, А. Хмяльніцкага, скульптурныя кампазіцыі А. Комава, творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш.

На гэтай выстаўцы экспануюцца і работы беларускага мастака М. Савіцкага: «Партызанская мадонна» (у рэпрадукцыі), адзначаная сярэбраным медалем Акадэміі мастацтваў СССР у 1967 годзе, «Партызаны», «Ураджай», «Хлеб». Гледачоў уражваюць жывапісныя якасці, значнасць тэматыкі работ беларускага майстра.

Я. ФРАНЦАЎ.

ТРЭЦЯЯ АРШАНСКАЯ

Слаўнаму 50-годдзю ВЛКСМ прысвечана трэцяя гарадская выстаўка твораў прафесіянальных і самадзейных мастакоў Оршы.

Пачуццямі любові да роднай зямлі прасякнуты работы жывапісцаў Н. Салтанава «Эцюд» і «Шэры дзень», А. Казлова «Асенняя свежасць» і «Роздум». Задушэўныя работы М. Бурунова. Яго эцюд «Яхты ўначы» вылучаецца высокай жывапіснай і кампазіцыйнай культурай.

Арыгінальныя творы самадзейнага рэзчыка па дрэве С. Шаўрова. Гумар, цеплыня пачуцця прасякаюць яго скульптуркі «Клюнула», «Двое з жарабём», «Шэйк».

З багатай творчай фантазіяй зроблены лялькі В. Кушнеравай. У арсенале яе вобразаў самыя нечаканыя тыпы лялек і арыгінальныя кампазіцыі — «Юдзіф», «Партызаны Беларусі».

Сярод графічных работ прыцягваюць увагу акварэлі А. Варановіча і В. Жытнова, каляровыя лінагравюры В. Ганчарова.

Выстаўка пераконвае, што мастацкія сілы Оршы мацнеюць.

В. ФУРМАН.

НА ГАСЦІННАЙ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Спецвыпускі кінахронікі—як блізняты. Яны часцей за ўсё чыста інфармацыйныя і не прэтэндуюць на большае. Але вось на экраны выйшаў невялікі дзесяцімінутны фільм «Верым у вашу перамогу» аб Днях В'етнама, якія праходзілі сёлета ў Беларусі, і адразу ж прыцягнуў увагу гледачоў.

«Верым у вашу перамогу»—таксама спецвыпуск, але малады рэжысёр-дакументаліст В. Міхайлоўскі зрабіў яго востра публіцыстычным. У нарціне паказаны найбольш цікавыя сустрэчы в'етнамскіх гасцей з працоўнымі нашай рэспублікі.

Амерыканскія агрэсары агнём і крывёю залілі в'етнамскую зямлю. В'етнаму патрэбна братняя дапамога, і беларускі народ падае руку мужнай краіне.

Экран пераносіць нас на Мінскі трактарны. Мы бачым сотні новых машын. Іх шлях—у далёкі В'етнам. І не толькі трактары шле Беларусь сябрам. Аўтамашыны, станкі, прадукты, медыкаменты, тавары шырокага ўжытку... Ды хіба ўсё пералічыш?

Расказ аб в'етнамскай дэлегацыі ў Беларусі рэжысёр В. Міхайлоўскі ўдала чаргуе з кадрамі гераічнай барацьбы народа з амерыканскімі агрэсарамі.

На экране—В'етнам. Неба засцілаюць хмары пажараў. Паветраныя піраты няспынна бамбяць гарады і сёлы, паляць напалмам палі і джунглі. Забойцы ў мундзірах расстрэльваюць старых, жанчын, дзяцей...

На бой з азвярэлым ворагам паднялися ўсе — ад малога да вялікага. Народ В'етнама выстаіць, народ перамажа! Мы верым у вашу перамогу!

Я. ВЫСОКІ

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР
АБ ПРЫСВАЕННІ ГАНАРОВАГА ЗВАННЯ НАРОДНАГА АРТЫСТА СССР ДЗЕЯЧАМ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За вялікія дасягненні ў развіцці савецкага мастацтва прысвоіць ганаровае званне **народнага артыста СССР:**

1. **Жыновічу (Жыдовічу)** Іосіфу Іосіфавічу — галоўнаму дырыжору Дзяржаўнага народнага аркестра Беларускай ССР.

2. **Стоме** Здзіславу Францавічу — артысту Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

3. **Цітовічу** Генадзю Іванавічу — мастацкаму кіраўніку Дзяржаўнага народнага хору Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ПАДГОРНЫ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква. Крэмль. 19 верасня 1968 г.

ВІНШУЕМ!

МАЛАДОСЦЬ СТАЛАСЦІ

Прысваенне Іосіфу Іосіфавічу Жыновічу высокага звання народнага артыста СССР супала з яго шасцідзесяцігоддзем. Але пражытыя ім гады ніколькі не састарылі яго, а толькі дадалі вопыту, сталасці, ведаў. І ў выканаўчым майстэрстве, і ў кампазітарскай творчасці, і ў педагогіцы, і ў грамадскай рабоце, і назад знешне ён заўсёды малады, абаяльны, поўны творчых і жыццёвых сіл, планаў, намераў, пошукаў. Такім я ведаю яго вось ужо сорак гадоў, і ён для мяне не мяняецца, усё такі ж юны, бадзёры. Мастак з вялікай літары.

Уся творчая біяграфія І. Жыновіча — гэта нястомныя пошукі мастацкай праўды, імкненне зрабіць музыку зразумелай і любімай для кожнага.

Шматстайная, шырокая і ўсебаковая мастацкая дзейнасць І. Жыновіча атрымала ўсенароднае прызнанне. Яго заслугі ў рэканструкцыі цымбал і дудак, стварэнні і бурным росквіце аркестра народных інструментаў БССР, аснову якога складае цымбальная група, у раззвіцці выканаўчага майстэрства, у падрыхтоўцы кадраў — вельмі вялікія. І. Жыновіч — аўтар адзінай у свеце «Школы ігры на цымбалах». Яго мастацтва шырока вядома ў нашай краіне і далёка за яе межамі па заграніччых гастролях.

Прысваенне І. Жыновічу высокага звання народнага артыста СССР з радасцю ўспрымаецца ўсімі, каму дорага наша многанацыянальнае мастацтва. Усе мы чакаем новых яркіх праяў творчай дзейнасці гэтага таленавітага сына беларускага народа.

Я. ЦІКОЦКІ,
народны артыст СССР.

САМАБЫТНЫ ТАЛЕНТ

Другое пакаленне купалаўцаў вылучыла шэраг слаўных майстроў сцэны, сярод якіх — Здзіслаў Францавіч Стомэ. У апошні час ён з поспехам замяняў выдатных Б. Платонава і Г. Глебава ў класічных вобразах Быкоўскага і Пустарэвіча ў «Паўлінцы», Тулягі ў «Хто смяецца апошнім?», Лявона Чмыха з «Лявоніхі на арбіце». Але самабытны талент Стомы вылучыўся даўно, яшчэ ў саракавыя гады, у многіх ролях, выкананых на сцэне Першага беларускага, цяпер Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Здзіслава Стому — таленавітага акцёра ведаюць не толькі ў Мінску, але і ў многіх гарадах Савецкага Саюза. Яго выкананне Белагубава ў камедыі А. Астроўскага «Даходнае месца», паказанай на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве (1955 г.), выклікала захапленне гледача і высокую ацэнку тэатральнай крытыкі, як ярка камедыйнае, адухоўленае і майстэрскае выкананне аднаго з цікавейшых вобразаў рускай класікі.

Акцёрскі дыяпазон З. Стомы вельмі шырокі. У яго рэпертуары самыя разнастайныя ролі: Епіходаў у «Вішнёвым садзе» А. Чэхава, Кастылёў у «На дне» М. Горкага, Генадзь у п'есе Б. Рамашова «Вогненны мост», Сеньказейка ў камедыі А. Макаёнка «Каб людзі не журыліся», Глап'е ў драме В. Гюго «Тысяча франкаў узнагароды» і шмат іншых.

Адна з апошніх роляў З. Стомы — Глушак у спектаклі купалаўцаў «Людзі на балоце» па раману І. Мележа. Роля гэтая ў ліку іншых вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі СССР.

Фарміраванне творчай індывідуальнасці З. Стомы праходзіла розныя этапы. Былі радасныя перамогі, былі і насцярожваючыя няўдачы. Але сёння мы можам з поўнай падставай сказаць, што на сцэне тэатра імя Янкі Купалы выступае выдатны акцёр, які яшчэ не раз парадуе самых патрабавальных гледачоў новымі яскравымі знаходкамі, цікавымі характарамі. Яго рэалістычнае выкананне заўсёды вызначаецца высокай пластычнасцю і дасканалым унутраным рытмам.

Я асабіста і ўсе, хто ведае гэтага цудоўнага майстра сцэны, вітаем яго з высокім ганаровым званнем.

Яўген РАМАНОВІЧ.

РАДАСЦЬ СЯБРА—НАША РАДАСЦЬ

Шчыра радуюся за свайго сябра, таварыша. Генадзю Іванавічу Цітовічу прысвоена самае высокае ганаровае званне — народнага артыста Савецкага Саюза.

Удумваючыся ў сэнс і літару таго пачэснага звання, якое цяпер прысвоіў Генадзю Іванавічу Савецкі ўрад, пачынаеш разумець усю тую дзейнасць, якую вёў і якую вядзе цяпер у народзе Генадзь Іванавіч. Я неяк спрабаваў хоць у думках асягнуць усе тыя дарогі, якія прайшоў цяперашні народны артыст СССР па прасторах народнага жыцця. І дзіва: як часта і густа нітаваліся дарогі яго маладосці, сталасці і мудрай мужнасці з дарогамі жыцця народа: там ён запісваў песні, там падгледзеў пільным і дапытлівым вокам народны танец, як самародак; там ён пабываў з ансамблем, вяртаючы людзям узбагачаныя творчай фантазіяй іх песні і танцы; там ён пачуў добрыя,—вунь якія!—галасы і вырашыў, як бы там ні было, а каб яны ўліліся ў агульны скарб ансамбля народнай песні БССР.

Калі б хто спецыяльна пацікавіўся дэмаграфічнымі дадзенымі артыстаў ансамбля народнай песні, яму б няцяжка было заўважыць, што яны як бы прадстаўляюць усе пласты беларускага народа, усе геаграфічныя шыроты рэспублікі, быццам хто спецыяльна клапаціўся, каб уся рэспубліка была прадстаўлена ў калектыве.

А мо і клапаціўся? Мо сам Генадзь Іванавіч, які, як гэта прынята казаць, стаяў ля калыскі калектыву? Ён яшчэ тады, калі хор быў немаўлёнкам, ужо ў думках песціў яго саказітыя галасы. Збіраючы ўдзельнікаў ансамбля, ён вучыў іх любіць і шанаваць народную песню, як неацэнны скарб жыцця.

І не дзіва, што цяпер, калі ведаюць Беларускі народны хор па ўсім Савецкім Саюзе, у сацыялістычных і нават некаторых капіталістычных краінах, ён удасканальваецца і ўдасканальваецца. Кіраўнік яго такі, што не ведае меры добрага. Майстэрства яго — гэта адбітак, зліпак народнага жыцця, якое ніколі не было спрошчаным.

Пра Генадзя Іванавіча Цітовіча можна пісаць бясконца. Сёння трэба радавацца ягонаму поспеху, прызнанню майстэрства калектыву, якім ён кіруе, якому аддае ўсё багацце сабраных у народным жыцці песенных скарбаў, але сёння мне, як, мабыць, і другім, ад самага шчырага сэрца хочацца павіншаваць дарагога сябра з высокай годнасцю народнага артыста СССР. Гэта прызнанне ўсяго нашага сапраўды народнага мастацтва.

Хвала і слава табе, дарагі Генадзь Іванавіч!
Хвала і слава песні, якую ты нясеш, як сцяг народнага жыцця!

Раман САБАЛЕНКА.

ШТАБ ЗАВОДСКІХ АРТЫСТАЎ

РЭСПУБЛІКАНСКІ ДОМ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ПРАФСАЮЗАЎ—НОВАЯ КУЛЬТАСВЕТУСТАНОВА

Паводле рашэння сакратарыята ВЦСПС ва ўсіх саюзных рэспубліках, краях і абласцях нашай краіны ствараюцца дамы мастацкай самадзейнасці саветаў прафсаюзаў.

У Беларусі пачаў работу Рэспубліканскі Дом мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа. Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» папрасіў дырэктара гэтай установы, заслужанага артыста БССР А. Білібіна расказаць пра задачы, якія стаяць перад ёю, пра яе першыя крокі.

— Рана, вядома, на поўны голас гаварыць пра нашу работу. Мы перажываем пакуль што арганізацыйны перыяд,—сказаў Аляксандр Іванавіч.—Але ўся далейшая наша работа будзе накіравана на развіццё самадзейнай народнай творчасці.

Мы будзем дапамагаць развіваць самадзейнасць на прадпрыемствах, у навучальных установах, саўгасах, на будоўлях і транспарце, фарміраваць рэпертуар самадзейных артыстаў, вывучаць, абагульняць і прапагандаваць вопыт лепшых аматарскіх калектываў, студый і гурткоў, праводзіць фестывалі, конкурсы, выстаўкі, справаздачныя канцэрты, святы народнай творчасці.

Разам з творчымі саюзамі рэспублікі будзем праводзіць конкурсы на лепшыя творы для самадзейных калектываў па ўсіх жанрах, розныя семінары, курсы, творчыя канферэнцыі і кансультацыі для кіраўнікоў самадзейных гурткоў, будзем дапамагаць самадзейным кампазітарам, пачынаючым драматургам і аўтарам, якія пішуць сцэнарыі для агітбрыгад.

Рэспубліканскі Дом мастацкай самадзейнасці наладзіць цесныя кантакты з органамі культуры, дзеячамі мастацтва, творчымі саюзамі. Наш клопат—і шэфская работа гарадскіх самадзейных калектываў над сельскімі.

У Доме мастацкай самадзейнасці ствараюцца дзевяць творчых аддзелаў: тэатральны, музычны, харэаграфічны, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кінафотааматараў, аддзел па мастацкім выхаванні дзяцей, рэпертуарна-бібліяграфічны, арганізацыі адпачынку працоўных і аддзел павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці.

Зараз мы камплектуем штаты. Хочацца, каб метадысты нашага Дома былі кваліфікаванымі спецыялістамі.

Адначасова складаем план работы на бліжэйшыя тры месяцы. Думаю, што мы ўжо здольны дапамагчы калектывам мастацкай самадзейнасці прафсаюзаў у падрыхтоўцы да агляду, прысвечаных 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Адной з першачарговых задач лічым стварэнне і выданне рэкамендацыйных спісаў рэпертуару, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, для хораў, салістаў, чытальнікаў, аркестраў духавых і народных інструментаў, народных тэатраў і драматычных гурткоў.

Зараз пры Доме мастацкай самадзейнасці ствараецца бібліятэка, якую ўкамплектуем літаратурай, неабходнай аматарскім калектывам. Тут будуць розныя рэпертуарныя зборнікі і матэрыялы, метадычная літаратура. Думаем займець таксама і сваю фанатэку.

Ствараюцца Дамы мастацкай самадзейнасці і пры абласных саветах прафсаюзаў. У бліжэйшы час правядзём інструкцыйную нараду дырэктараў абласных Дамоў мастацкай самадзейнасці.

ПА СТАРОНКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕНІНІЯНЫ

ЖЫВЫЯ РЫСЫ ІЛЬІЧА

Пятро ГЕРАСІМОВІЧ

Жыццё і дзейнасць Уладзіміра Ільіча, яго вобраз чалавека і мысліцеля, настаўніка і правадыра працоўных усяго свету — невычэрпная крыніца натхнення мастакоў. Яны добра ўсведамляюць, што праца над увасабленнем вобраза Леніна—самая ганаровая, самая адказная і самая складаная з усіх магчымых творчых задач. Вырашаючы гэтую задачу, мастакі нашай рэспублікі назапасілі пэўны вопыт. І сёння, калі ў майстэрнях скульптараў і жывапісцаў, графікаў і майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва нараджаюцца новыя творы, прысвечаныя Ільічу, нельга не азірнуцца на тое, што ўжо зроблена, каб больш ясна ўявіць сабе шляхі ўзбагачэння беларускай Ленініяны.

Яшчэ ў 1925 годзе, на Першай усебеларускай мастацкай выстаўцы, гледачы ўбачылі партрэт Уладзіміра Ільіча, напісаны В. Волкавым. Поспеху мастака ў гэтай рабоце спрыяла яго знаёмства з натурнымі партрэтамі У. І. Леніна, створанымі скульптарам М. Андрэевым і жывапісцам І. Бродскім. Работа В. Волкава вызначалася дасканалым рысункам, выразнай кампазіцыяй, высокай жывапіснай культурай. Адзін з лепшых тагачасных твораў маладога беларускага савецкага мастацтва, гэты партрэт паклаў пачатак галерэі вобразаў выдатных дзеячоў Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, якія стварылі затым беларускія мастакі.

Да пачатку трыццатых гадоў адносіцца спроба І. Ахрэмчыка стварыць манументальнае палатно «Другі з'езд РСДРП». Жывапісец паказаў тады эскіз карціны на невялікай выстаўцы твораў выкладчыкаў Віцебскага мастацкага тэхнікума. Гэты эскіз вылучаўся арыгінальнасцю кампазіцыі, эмацыянальнай жывапіснай мовай. Уладзімір Ільіч быў паказаны ў цесным акружэнні аднадумцаў — дэлегатаў з'езда.

І. Ахрэмчык грунтоўна рыхтаваўся да напісання эскіза. Ён сустракаўся з Н. Крупскай, Р. Зямлячкай, Е. Ярославскім, вывучаў архіўныя матэрыялы, кнігі па гісторыі партыі. На вялікі жаль, удалы эскіз не стаў карцінай. Прычын было многа—не ўсё залежала ад волі мастака.

У дваццатыя і трыццатыя гады, калі мастацтва нашай рэспублікі сталела, былі цікавыя спробы стварыць вобраз Уладзіміра Ільіча і ў беларускай скульптуры.

Так, у 1925 годзе А. Грубэ стварыў статую У. І. Леніна для Камвуза ў Мінску. А ў 1931 годзе ён прыняў актыўны ўдзел у конкурсе на праект помніка У. І. Леніну перад Домам урада БССР. Яшчэ праз два гады А. Грубэ выконвае праект помніка У. І. Леніну для горада Барысава. Гэты праект быў ухвалены ўрадам БССР. У 1935 годзе помнік адкрылі. Тады ж, у трыццатыя гады, па праекце А. Грубэ быў пастаўлены яшчэ адзін помнік правадыру — параўнаўча вялікая статуя каля клуба будаўнікоў у Мінску. Але найбольш змястоўны і выразны па пластыцы вобраз Ільіча атрымаўся ў скульптара ў 1940 годзе. Гэта пауфігурны партрэт У. І. Леніна на трыбуне—лепшы з усіх твораў А. Грубэ, прысвечаных Ільічу. У гэтым вобразе скульптар акцэнтуе рысы выдатнага прамоўцы, палымянага трыбуна, поўнага веры ў народ.

У актыве даваеннай беларускай скульптуры — помнікі Ільічу ў Полацку (1936) і ў Слуцку (1938), створаныя А. Бембелем. У гэтых работах скульптара актыўна заявіў пра сябе талент манументаліста.

Балюча ўсведамляць, што цікавыя творы беларускіх мастакоў, прысвечаныя Ільічу ў перадваенныя гады, загінулі ў часе вайны ад рук фашысцкіх варвараў.

Нямала ўдалых твораў прысвяцілі Ільічу мастакі Савецкай Беларусі ў пасляваенныя гады.

На Рэспубліканскай мастацкай выстаўцы 1954 года мы ўбачылі буйную шматфігурную гістарычную кампазіцыю А. Шыбнёва «Ёсць такая партыя!». У рэчышчы рэалістычных традыцый мастак адлюстраваў адзін з важнейшых момантаў гісторыі нашай рэвалюцыі, калі Уладзімір Ільіч кінуў меншавікам знамянальныя словы аб тым, што ў Расіі ёсць партыя, здольная ў цяжкі для краіны час узяць на сябе адказнасць за яе пёс, узяць уладу. Мастак грунтоўна распрацаваў характары персанажаў — У. І. Леніна, рабочых, салдат, матросаў, іх праціўнікаў — меншавікоў.

Творчай індывідуальнасці А. Шыбнёва ўласціва імкненне да маштабных гісторыка-рэвалюцыйных палотнаў з вялікай колькасцю персанажаў. Яго хвалюе тэма ўзаемаадносін правадыра і народа—ёй прысвечаны і такія творы мастака, як «У красавіку 1917 года» (1956—1957) і «У. І. Ленін у Кастрычніку» (1962—1967). Рыхтуючыся да працы над гэтымі карцінамі, А. Шыбнёў вывучаў гістарычныя матэрыялы, пісаў эцюды, якія, дарэчы, нярэдка маюць самастойную мастацкую вартасць.

Асабліва плённа ў галіне гісторыка-рэвалюцыйнай карціны, звязанай з вобразам Ільіча, працуе К. Касмачоў. У 1947 годзе ў палатне «Ленін у Разліве» мастак спрабуе вырашыць вобраз правадыра як мысліцеля. Гэтай задуме падпарадкаваны жывапісныя акцэнты палатна. Уладзімір Ільіч, паклаўшы паперы на вялізны валун, задумаўся. Яго засяроджаны твар бачым на фоне барвовага фінскага неба. Навокал—прастор, цішыня. Матыў прыроды як бы падкрэслівае заклапочанасць, неспакой імклівай думкі Леніна.

Да паказу Ільіча ў Разліве, калі партыя камуністаў рыхтавалася да рашаючага штурму царызму, К. Касмачоў звярнуўся яшчэ раз у 1957 годзе. Ён напісаў карціну «Напярэдадні».

Увага гледача канцэнтруецца тут на ўнутраным напружанні вобраза. Трывога, неспакой правадыра рэвалюцыі падкрэслены настроем прыроды. Неба агорнута лёгкім туманам. Серабрыцца люстра вялікага возера. Нішто не перашкаджае глыбокаму роздуму Ільіча.

Як бачым, карціна нешматслоўная. Мастак дасягае ўвасаблення задумы ашчаднымі кампазіцыйнымі і жывапіснымі сродкамі. Удала вылучаны ў творы постаць і профіль Леніна.

«Напярэдадні» — карціна, якая атрымала ўсесаюзнае прызнанне. Гэта сапраўдная творчая ўдача патрабавальнага да сябе мастака. Высокую ацэнку гледачоў і мастацтвазнаўцаў атрымалі і графічныя варыянты гэтага твора.

1961—1962 гады. К. Касмачоў піша трыпціх «Незабыўнае». Тут Ленін паказаны з простымі людзьмі. Як шчыра гаворыць ён з імі!..

Прыкметнае месца ў беларускай Ленініяне належыць карцінам Я. Ціхановіча «У. І. Ленін і Н. К. Крупская з дзецьмі» (1960), І. Давідовіча «Вялікі пачын» (1960), А. Гугеля «У. І. Ленін сярод раненых чырвонаармейцаў» (1967). Гэтыя творы—пра вялікую чуласць Ільіча да простых людзей, пра неадольную цікавасць яго да іх настрояў і мар, пра неадрыўнасць жыцця правадыра ад жыцця народа.

Некалькі гадоў назад А. Гугель і Р. Кудрэвіч у сааўтарстве напісалі карціну «Апасіяната»: Ленін глыбока ўсхваляваны музыкай геніяльнага Бетховена. На адной з апошніх рэспубліканскіх мастацкіх выставак гледачы пазнаёміліся з карцінай А. Казлоўскага «У. І. Ленін у Шушанскім». Гэта таксама цікавы твор.

Шмат натхнення вобразу Ільіча аддае ў пасляваенныя дзесяцігоддзі і скульптар А. Бембель. У 1947 годзе ён стварае для інтэр'ера будынка ЦК КПБ партрэт правадыра—адзін з лепшых сваіх ленінскіх вобразаў. А праз два гады завяршае работу над статуарным партрэтам Уладзіміра Ільіча для Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. У гэтым партрэце правадыр паказаны ў момант, калі ён звяртаецца да народа. Змест партрэта падкрэсліваецца і самім характарам лепкі.

Блізкі па змесце да гэтага твора і пауфігурны кампазіцыйны партрэт Ільіча на трыбуне, створаны скульптарам у 1953 годзе. Ён смела скампанаваны, дынамічны, напружаны.

Мысліцель і вучоны, чалавек вялікі і ў той жа час надзвычай просты, мудры, блізкі кожнаму з нас—такі Уладзімір Ільіч у барэльефе, выкананым А. Глебавым у 1955 годзе. Тады ж скульптар стварыў і помнік У. І. Леніну для Горак на Магілёўшчыне, строгі і просты па кампазіцыі, выразны па характарыстыцы.

Доўга працаваў А. Глебаў над складанай шматфігурнай кампазіцыяй «Сустрэча У. І. Леніна на Фінляндскім вакзале ў красавіку 1917 года». Такое арыгінальнае і смелае пластычнае рашэнне, як у гэтай кампазіцыі, у беларускай скульптуры з'явілася ўпершыню.

Ужо сам зварот майстра да шматпланавага і маштабнага паказу ў скульптуры знамянальнай у гісторыі нашай рэвалюцыі падзеі—вельмі каштоўны.

Фігура Леніна—ідэйная і кампазіцыйная аснова групы. Яго падхапілі рабочыя, салдаты, матросы рэвалюцыйнага Петраграда, ахопленыя пачуццём радасці ад сустрэчы з правадыром, надзеяй на хуткую перамогу рэвалюцыі. Уся маса пададзена скульптарам у моцным парыве наперад, узнёсла, тэмпераментна. Гэта сапраўды эпічны твор.

Аднак, на жаль, тут не знойдзена адзіна магчымае месца асноўнага вобраза—каб ён быў пластычна звязаны з кожным з персанажаў групы, разлічанай на кругавы агляд.

Увасабляючы ў скульптуры жывыя рысы Ільіча, нашы майстры звяртаюцца да галаўнога і статуарнага партрэта, да манумента для залы і помніка для вялікай плошчы, да барэльефа і дзвюхфігурнай або шматфігурнай кампазіцыі. Амаль усе з гэтых жанраў знайшлі месца і ў творчасці З. Азгура.

Узнёсла і строга вырашаны скульптарам помнікі У. І. Леніну ў сяле Кашырына пад Масквой і ў Астрахані.

Проста, непасрэдна створана жанравая кампазіцыя «У. І. Ленін з дзяўчынкай». Тут актыўна выявілася ўмельства мастака перадаваць унутраны стан сваіх персанажаў, іх адухоўленасць.

Адным з лепшых твораў, паказаных на рэспубліканскай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, па праву лічыцца партэт У. І. Леніна, выразаны з дрэва П. Белавусавым.

Вядома, што стварыць шматгранны вобраз чалавека, у якім увасобіўся геній цэлага народа,—задача неймавернай цяжкасці. Але тым яна і прывабная для сапраўднага творцы, які адчувае грамадзянскую адказнасць перад народам.

Лепшыя творы нашага мастацтва, прысвечаныя Ільічу, а таксама творчыя планы многіх нашых мастакоў сведчаць, што гэтую сваю адказнасць нашы жывапісцы, скульптары, графікі, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адчуваюць. Высокі гонар — у творах сваіх сцвярджаць веліч Ільіча, веліч яго спраў, веліч неўміручай ленінскай думкі, якая жыве ў здзяйсненнях роднай партыі камуністаў. Нездарма вобраз У. І. Леніна і тэма Камуністычнай партыі—вядучая ў нашым мастацтве.

Тэатр

А ДЗЕ РОБІН ГУД?

Знайсці цікавую п'есу з запамінальным сюжэтам, якая б закранала сур'ёзныя пытанні і разам з тым была даступнай дзіцячаму гледачу — праблема. Мяркуецца, аднак, што, калі тэатр, асабліва — Янкі Купалы, адчуваючы рэпертуарны голад, вымушаны ўзяць для пастаноўкі п'есу недасканалую, дык пры гэтым ён усё-такі не ўсядны і з усяго рэальнага выбірае варыянт аптымальны. Аптымальны — значыць п'еса змяшчае, няхай у зародку, у эскізе, індывідуальныя характары і значную, сучасную думку. Такая аснова, памножаная на акцёрскія магчымасці і вопытную рэжысуру можа, несумненна, прынесці поспех — тэатральная практыка пацвярджае гэта.

Цалкам падзяляючы добрыя намеры тэатра імя Янкі Купалы паказаць дзецям спектакль ва ўлюбёным імі прыгодніцкім жанры, нам усё-такі цяжка растлумачыць выбар п'есы С. Заяіцкага «Робін Гуд». Пры знаёмстве з творам становіцца зусім відавочна, што тут, як кажуць, не да раскошы — не да цікавых характараў. Нават самы галоўны з іх — Робін Гуд — настолькі невыразны і банальны, што да праслаўленай у народным эпасе гераічнай, яркай асобы мае адносіны, бадай, чыста намінальныя. У п'есе як быццам і гаворыцца аб тым, што Робін Гуд — чалавек вялікай адвагі, дасціпнасці, што ён справядлівы, вясёлы, непераможны і адначасова, як і ўсякі чалавек, не пазбаўлены недахопаў, але аб гэтым толькі гаворыцца. У драме герой, як вядома, выяўляе сябе, галоўным чынам, у дзеянні, ва ўчынку, у актыўным канфлікце. Але ў п'есе вось гэтага якраз і няма.

Ёсць, па сутнасці, адна карціна, дзе Робін Гуд выходзіць самнасам з праціўнікам — шэрыфам Нотынгемскім. Астатнія падзеі (іх, між іншым, здараецца не так ужо мала) маюць ускосную сувязь з Робін Гудам, дакладней, Робін Гуд ускосна ў іх удзельнічае.

Каб быў зразумелы ход нашых разваг, коратка раскажам змест.

Рыцар Гай Гінзборн, які вязе шэрыфу Нотынгемскаму загад злавіць Робін Гуда і пакараць смерцю, сам трапляе ў палон да ляснога атамана. Робін Гуд дапытвае палоннага, выдае яму ўзамен раскошнага рыцарскага ўбрання адзенне ляснога разбойніка і здае яго замест сябе шэрыфу. У час бою рыцары схапілі і даставілі ў турму маленькага Джона. Пераапрануты ў Гая Гінзборна Робін Гуд з'яўляецца да шэрыфа і выратоўвае Джона, а разам з ім беднату, пасаджаную за краты за няўплату падаткаў.

Рэжысёр спектакля — дыпломнік Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага Касэм Ібрагім, відаць, імкнуўся паказаць цікавае відовішча з баямі на шпагах, гумарам, з вясёлымі песенькамі на вершы Роберта Бёрнса, з таксама выявіць і перадаць надзвычайную выключнасць і маштабнасць подзвігаў галоўнага героя.

Але захапіўшыся формай, відовішчам, рэжысёр прынёс у ахвяру галоўнае спектакля. Яркая форма, трук, выключнасць на сцэне, як, між іншым, і звычайная рэальнасць, патрабуе моцных матывіровак, інакш яна ператвараецца ў фальш і выклікае недавер нават у такога гледача, як дзеці. Возьмем, напрыклад, наступную карціну. На сцэне ўмоўна-фантастычныя лясныя нетры, дзе знаходзяць прыстанак Робін Гуд і яго спадручныя. Тут і папаўся Гай Гінзборн у рукі атаману. Каб даведацца пра мэту паездкі рыцара да шэрыфа, Робін Гуд выдае сябе за шэрыфа. Містыфікацыя разыгрываецца ў такіх абставінах, што Гінзборн лагічна не можа прыняць яе за праўду, а трэба. І акцёру (А. Памазан) не застаецца нічога іншага, як адмовіць свайму персанажу ў элементарным розуме, і прытрымлівацца гэтай пазіцыі да канца.

Дапусцім, што Гінзборн настолькі тупы і дурны, што без усялякага сумнення гатовы прыняць лясныя нетры за рэзідэнцыю шэрыфа, а Робін Гуда і лясных братоў—за шэрыфа і падначаленых. Аднак па меры знаёмства з іншымі героямі спектакля аказваецца, што ўсе праціўнікі Робін Гуда, мякка кажучы, людзі занадта наіўныя.

Так, акцёру П. Дубашынскаму ўласцівы мяккая характарнасць, гумарыстычныя фарбы і, як кажуць, на акцёрскай мове, станоўчае абаянне. Гэта не значыць, што ён не павінен іграць герояў адмоўных. Наадварот. Пры дакладнай рэжысуры ўласцівасць такой індывідуальнасці ў адмоўнай ролі могуць даць каштоўную шматпланавасць.

І П. Дубашынскі, безумоўна, мае рацыю, там дзе ён адыходзіць ад прасталінейных, лабавых прыёмаў у характарыстыцы шэрыфа. Характэрна: шэрыф дае загад пакараць смерцю зняволеных мімаходзь, між іншым, з усмешкай на твары. На жаль, гэта адзіная дэталь не стала ключом для вырашэння вобраза. Пераважна роля вядзецца ў пацешна-камедыйных тонах (спрэчкі са Скелтанам, а таксама з суддзёй). І ў выніку, фігура Натынгемскага — дабрадушная, забаўная, смешная і толькі.

Прыкладна такі самы падыход да вобраза суддзі ў І. Струсевіча. Суддзя з'яўляецца на сцэну, з дзіцячым захапленнем аблізваючы ледзянец на палачцы. У сваіх службовых справах яму ніяк не разабрацца — перашкаджае безнадзейная глухата, і наогул ён ужо ў тым узросце або ў тым стане, пра які ў народзе кажуць — здзяцінеў. Калі б была ў спектаклі другая расстаноўка сіл, мы б гаварылі аб маленькай, але каларытна сыгранай ролі. У кантэксце ж «Робін Гуда» работа І. Струсевіча, як і ў многім работа П. Дубашынскага грунтоўна пярэчыць логіцы спектакля, таму што рэжысёр упусціў тут патрэбныя, можа, галоўныя акцэнты. Атрымліваецца, што ворагі Робін Гуда лёгка купляюцца на розыгрыш, што іх лёгка абдурыць і вельмі проста перамагчы. Ад гэтага ў першую чаргу прайграе сам Робін Гуд.

З акружэння шэрыфа трапляе ў цэль, бадай толькі, трактоўка Скелтана (Г. Аўсяннікаў). Скелтан, праўда, таксама не вельмі разумны, але што з яго возьмеш, ён усяго толькі дробны служка, сакратар Натынгемскага. Ён адзеты ў ярка-чырвоны касцюм, ён своеасаблівы стыляга, калі можна так сказаць, памятаючы, што час дзеяння спектакля — сярэдневякоўе. Скелтан пастаянна п'яны, але ўсяляк утойвае гэта ад шэрыфа, які можа прагнаць, а то і пасадзіць у турму. І трэба бачыць, да чаго (не фармальна, а апраўдана!) смешны сакратар, калі ён у нецвярозым стане, вылупіўшы мутнае вока, спрабуе трапіць пяром у чарніліцу, а потым выводзіць старанна пад дыктоўку тэкст пісьма каралю, запісваючы заадно і лаянку шэрыфа.

Мы ўжо адзначылі вышэй, што ў п'есе не пашанцавала Робін Гуду і што ў спектаклі яго перамогі знявіраваны слабым праціўнікам. Натуральна, што Мілаванаў аказаўся ў найбольш цяжкім становішчы. Ранейшыя выступленні А. Мілаванава адкрываюць у ім акцёра творча вельмі цікавага. Тым больш прыкра за Робін Гуда, які стаў прахадной роллю. Мілаванаў у «Робін Гудзе» свядома адмаўляецца ад прыёмаў выпадковых, разлічаных на знешні эфект, ён робіць усё, каб іграць псіхалагічна верагодна. І было б няправільна сцвярджаць, што Мілаванаву — Робін Гуду не хапае значнасці. Значнасць ёсць, ды вузкія рамкі ролі скоўваюць акцёра, не даюць раскрыцца ў поўную меру.

Арыенціруючыся на агульныя ўмовы спектакля, галоўнага героя можа варта іграць з большым знешнім эфектам (гэта не выключае псіхалагічнай распрацоўкі вобраза). Мусіць яму трэба больш энергічна, больш спрытна валодаць шпагай.

Няма патрэбы падрабязна спыняцца на ўсіх дзеючых асобах спектакля. Дадамо толькі, што С. Некіпелавай (Сесіль—малодшая дачка шэрыфа) хочацца параіць пазбавіцца празмернай сентыментальнасці. Па задуме — яна хлапчук у спадніцы і паслядоўнасць у малюнку не пашкодзіць. Нам здаецца, старэйшая дачка (М. Громава) дабіваецца правільных вызначэнняў ролі, калі яе Кларында са скуры лезе, каб спадабацца рыцару — пераапранутаму Робін Гуду. Актрысе трэба толькі помніць, што Кларында — дачка свайго бацькі, па ідэі — жорсткага, тады ў ролі знікне аднастайнасць, якая пакуль адчуваецца.

Фармальны падыход выяўляецца ў рэжысёра ў вырашэнні лясных сцэн. Няма сэнсу ў вяроўках, падвешаных да каласнікоў, на якіх акцёры паводле рэжысёрскай фантазіі, перасоўваюцца па-тарзанску ў сцэнічнай прасторы. Чаму збраяносец Гая Гінзборна называе свайго ўмоўнага каня Расінантам? І чаму сярод песенек, вытрыманых у народным стылі (кампазітар М. Кармінскі) эклектычна выбіваецца песня Кларынды, якая інтанацыямі парадыруе сучасны эстрадны баявік? Яшчэ мноства «чаму» спектакль пакідае без адказу. Але самае нялёгкае пытанне задаюць у канцы спектакля дзеці: «Дзе ж Робін Гуд?»

Можа мы вельмі строга падышлі да ацэнкі спектакля: яго ж ставіў дыпломнік і наш госць.

Але справа не ў тым, што слабыя бакі пастаноўкі выкліканы толькі нявопытнасцю, хоць, вядома, і ёю таксама. Яны выкліканы ў прынцыпе няправільным выбарам п'есы і ў прынцыпе чужой традыцыям тэатра імя Янкі Купалы рэжысурай. А гэта і прымусіла нас звярнуцца да спектакля, хоць з дня прэм'еры яго і прайшло паўгода.

І. ГАТОЎЧЫЦ.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У Рускім драматычным тэатры імя Горкага адбылася прэм'ера спектакля па п'есе Веры Пановай «Яшчэ не вечар». Пастаноўку ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў КазССР і заслужаны артыст КАССР М. Сулімаў. Мастак Т. Сцяпанава, кампазітар Ф. Брук.

На здымку вы бачыце сцэну са спектакля. У ролі Калерыі—народная артыстка БССР А. Клімава, у ролі Канстанціна Алесава — народны артыст БССР Р. Янкоўскі.

Фота Ул. КРУКА.

СЛОВА ПРА НАСТАЎНІКА

Дзмітрыю КАМАРОВУ— 85 гадоў

Тыя з нашых мастакоў, што вучыліся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы ў дваццатых гадах, добра ведаюць выкладчыка жывапісу, малюнка, пластычнай анатоміі, перспектывы Дзмітрыя Іванавіча Камарова. Ведаюць яго і тыя, што ў першай палавіне шасцідзесятых вучыліся ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце: Дзмітрый Іванавіч быў тут старшым выкладчыкам.

З юнацтва шчыра пасябраваў Д. Камароў з Валянцінам Віктаравічам Волкавым. Разам яны паступілі ў 1901 годзе ў Пензенскае мастацкае вучылішча, дзе вучыліся ў выдатнага прадстаўніка рускага дэмакратычнага рэалізму К. Савіцкага. Разам былі і ў Пецярбурзе — у Акадэміі мастацтваў. Разам выкладалі ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме. Гэтая дружба захоўвалася да самых апошніх дзён жыцця В. Волкава.

Навучаючыся ў Акадэміі мастацтваў у В. Савінскага і П. Чысцякова, Д. Камароў не раз атрымліваў прэміі за выдатныя поспехі ў жывапісе. Скончыўшы акадэмію ў 1917 годзе, ён атрымаў дыплом першай ступені, а яго дыпломная работа «Ля домны» неўзабаве была набыта для экспазіцыі Капенгагенскай карціннай галерэі.

Аддаючы сілы і веды выкладчыцкай працы, Д. Камароў нямала працуе і як жывапісец. Ён — актыўны ўдзельнік мастацкіх выставак у Ленінградзе, на Украіне і ў Беларусі. Адна з апошніх персанальных выставак адбылася ў Мінску ў Саюзе мастакоў БССР у 1963 годзе.

Сярод твораў мастака — палотны «Коксавыя печы», «Партрэт Стаханава», «Малаціьба ў калгасе», «На калгаснай пасецы» і іншыя.

Многія з твораў Д. Камарова загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Захаваліся пераважна работы ранняй творчасці. Частка іх набыта Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, у тым ліку і эскіз дыпломнай работы «Ля домны». Мастак-рэаліст, прысвячаючы свае творы працы і побыту сучаснікаў, піша і партрэты. Яны вызначаюцца майстэрствам перадачы душэўнага стану чалавека.

21 верасня Дзмітрыю Іванавічу споўнілася восемдзесят пяць гадоў. Азіраючыся на пройдзены шлях, ён з поўнай на тое падставай можа сказаць: зроблена нямала. Сваё ўмельства маляваць, багатую жывапісную культуру ён перадае вучням. І кожны, хто ў яго вучыцца, ад усяе душы кажа яму:

— Шчырае дзякуй вам, Дзмітрый Іванавіч!

Ул. САКАЛОЎ.

50 Экскурсійнае БЮРО ЛіМа

КУПАЛАЎ ДОМ

Мы з вамі ў цэнтры Мінска, на вуліцы Янкі Купалы, упрыгожанай зялёнымі, купчастымі ліпамі. Тут, у садзе ля Свіслачы, стаяў да вайны невялікі драўляны дом, дзе жыў і працаваў з 1926 па 1941 год народны паэт Беларусі Янка Купала. Гэты дом спалілі фашысты ў 1941 годзе. У агні загінулі шматлікія рукапісы паэта, багатая бібліятэка, калекцыі нот, пласцінак, мастацкіх рэчаў.

Адразу пасля вайны па пастанове ЦК КПБ і ўрада рэспублікі ў Мінску быў адкрыт Літаратурны музей Янкі Купалы. Спачатку ён размяшчаўся ў двух пакоях Дома прафсаюзаў, пазней—у пяці залах Саюза пісьменнікаў па вуліцы Энгельса. А вось гэты трохпавярховы дом музея, у які мы зараз з вамі заходзім, гасцінна адчыніў свае дзверы 17 мая 1960 г. Дзесяць пакояў новага дома адведзена пад экспазіцыі, астатнія—пад бібліятэку, чытальню, лекторый, фонды, кабінеты для навуковай працы, фоталабараторыю...

Літаратурны музей Янкі Купалы — мемарыяльна-манаграфічны. Пра жыццё і творчасць Я. Купалы расказваюць кнігі паэта, яго асабістыя рэчы, дакументальныя фотаздымкі, карціны, малюнкі, скульптуры, творы народных умельцаў.

Спыніцеся, калі ласка, вось тут, на пляцоўцы другога паверха, паглядзіце ў гэтае акно. Вунь там, за маленькай зялёнай агароджай, некалі расла славутая Купалава таполя. У адну восеньскую ноч бура зламала яе. З кораня пайшлі парасткі новай. Тут жа, каля музея, расце маладая дужая таполя, пасаджаная пасля вайны рукамі жонкі паэта і першага дырэктара музея Уладзіславы Францаўны Луцэвіч.

Экспазіцыя нашага музея пачынаецца з мастацкіх твораў беларускіх майстроў пэндаля. Злева—трыпціх М. Савіцкага па сюжэту паэмы «Курган», справа—трыпціх І. Давідовіча, прысвечаны паэме «Над ракою Арэсай», а ў цэнтры—дэкаратыўнае пано народнага мастака БССР В. Цвірко. Вобраз жняі тут—гэта і сімвал роднай Беларусі, і сімвал беларускай жанчыны-працаўніцы, захавальніцы народнай песні. Той песні, якая з'явілася асновай Купалавай творчасці, крыніцай яго натхнення, і якую будучы паэт чуў і ў сваёй хаце ў Вязынцы, і ў Сенніцы, і ў Беларучах, дзе вучыўся грамаце.

Вы бачыце на здымках маці і бацьку паэта. У іх простыя сялянскія твары і ў той жа час мудрыя. Маці навучыла будучага песняра любві да песні, бацька—сялянскай працавітасці і разважлівасці.

А грамадзянінам Івана Дамінікавіча выхаваў народ. Ён сустракаўся з С. Чаховічам—удзельнікам паўстання 1863 года, паплечнікам Кастуся Каліноўскага, браў у яго кніжкі рэвалюцыйна-дэмакратычнага зместу. Можа менавіта яны і падказалі Янку думку напісаць свае першыя вершы на польскай мове, паслаць іх у варшаўскі часопіс «Зярно». Думка ў тых вершах была тая ж, што пазней і ў першым вершы на роднай мове «Мужык» — пра лёс селяніна, пра яго чалавечую годнасць. Першым яго літаратурным настаўнікам быў Ядвігін Ш., якога за рэвалюцыйную дзейнасць выключылі з Маскоўскага універсітэта. Іх партрэты таксама прадстаўлены ў экспазіцыі.

У 1908 годзе Купала пераязджае ў Вільню. Тут ён працуе ў рэдакцыі газеты «Наша ніва» і бібліятэцы «Веды» Б. Даніловіча, тут упершыню знаёміцца з марксісцкай літаратурай. Пакуль што не прадстаўлены ў экспазіцыі творы Маркса і Энгельса, Леніна, Пляханава, Мерынга, Бебеля, Лібкнехта, якімі карыстаўся Янка Купала. Але частка бібліятэкі «Веды» музеем набыта і хутка наведвальнікі змогуць з імі азнаёміцца.

1908 год быў знамянальным для Купалы і тым, што ў пецярбургскай выдавецкай суполцы «Загляне сонца і ў наша ваконца», якая існавала на добраахвотныя ўзносы добразычліўцаў, выходзіць яго першы зборнік «Жалейка».

Пазней, таксама ў Пецярбургу, з'яўляюцца кніжкі «Гусляр» (1910) і «Шляхам жыцця» (1913). Бачыце, які несамавіты выгляд у гэтых рэдкіх выданняў. Невялікі быў іх тыраж, першы зборнік двойчы канфіскоўваўся, а два другія распаўсюджваліся Іванам Дамінікавічам і яго блізкімі сябрамі нелегальна, у час паездак па вёсках і мястэчках. Тут жа экспануюцца ноты мелодый, напісаных кампазітарамі Л. Рагоўскім, У. Тэраўскім і М. Чуркіным да купалаўскага верша «А хто там ідзе?», які быў своеасаблівым гімнам беларусаў.

Вобраз чалавека-працаўніка, селяніна ляжыць у аснове ўсёй дакастрычніцкай творчасці Купалы—у драматычных паэмах «Адвечная песня», «Сон на кургане» (1910), «На палацах» (1913), п'есах «Паўлінка» (1912), «Раскіданае гняздо» і «Прымакі» (1913).

З пецярбургскага перыяду жыцця паэта ў музеі ёсць цікавы фотаздымак членаў беларускага гуртка, які існаваў пры універсітэце. На здымку—Іван Дамінікавіч, брат прафесара Б. Эпімах-Шыпілы Уладзімір і іншыя прыхільнікі беларускага слова: студэнты, рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя. Яны часта ладзілі вечары, даклады, ставілі спектаклі. У гэтым гуртку Купала ўпершыню прачытаў верш «Прарок» і паэму «Курган», тут упершыню ставілася «Паўлінка» ў музычным афармленні літоўскага кампазітара С. Шымкуса.

Многія экспанаты расказваюць пра нашаніўскі перыяд жыцця Я. Купалы. Сярод іх—карціна І. Давідовіча і Я. Ціхановіча «Я. Купала і З. Бядуля ў рэдакцыі «Нашай нівы», фотаздымкі таго часу Я. Коласа, Цёткі, Ц. Гартнага М. Багдановіча, У. Галубка, Я. Журбы, А. Гурло, К. Буйлы, С. Палуяна і іншых актыўных аўтараў «Нашай нівы». Купала клапаціўся аб росквіце таленту кожнага з іх. Не здзіўляйцеся, што ў купалаўскім музеі ўбачыце кніжкі М. Багдановіча «Вянок» і К. Буйлы «Курганная кветка»: іх складаў і рэдагаваў Іван Дамінікавіч.

Першая сустрэча з Я. Коласам у Смольні, вучоба ў Маскоўскім народным універсітэце імя А. Шаняўскага, праца ў рабочым батальёне на чыгунцы ў Мінску, Полацку і Смаленску, дзе Янка Купала сустрэў Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю,—усе гэтыя вехі ў жыцці паэта знайшлі ў музеі належнае адлюстраванне. Ім адведзены першыя тры залы.

Астатнія сем—прысвечаны савецкаму перыяду жыцця і творчасці паэта.

Калі ў 1919 годзе Цішка Гартны паведаміў Купалу аб стварэнні БССР, той адказаў: «Я даўно чакаю таго дня, каб вярнуцца ў Беларусь. Мне хочацца хутчэй уключыцца ў літаратурную работу...» Вярнуўшыся на радзіму, паэт працуе ў розных установах—бібліятэцы Народнага дома, у Наркамасвеце і Інбелкульце, піша вершы, перакладае, рэдагуе.

Звярніце, калі ласка, увагу на віленскае, 1919 года, выданне драмы «Раскіданае гняздо». Гэта першае выданне твораў Я. Купалы ў савецкі перыяд. Тут жа зборнік выбраных вершаў Купалы, выдадзены ў Маскве на рускай мове ў гэтым жа годзе.

У 1925 годзе ўрад рэспублікі надаў Янку Купалу званне народнага паэта Беларусі. На адным са стэндаў — поўны тэкст пастановы Савета Народных Камісараў БССР, прынятай з выпадку 20-годдзя творчай дзейнасці паэта. За гэты час «Ян Дамінікаў Луцэвіч (Янка Купала) развіўся ў выдатнага нацыянальнага паэта, волата беларускага прыгожага пісьменства...»,—гаворыцца ў пастанове, падпісанай старшынёй Савета Народных Камісараў БССР Язэпам Адамовічам і кіраўніком спраў Саўнаркома М. Марозам.

Экспанаты наступных залаў расказваюць пра паэтычную, навуковую і культурную дзейнасць песняра ў 20-я і 30-я гады—пра яго ўдзел у рабоце навукова-тэрміналагічнай камісіі Акадэмічнага цэнтра, кааператыўна-выдавецкага таварыства «Савецкая Беларусь», у рабоце з'ездаў Саветаў, першага беларускага з'езда загадчыкаў хат-чытальняў, пленумаў пісьменніцкіх арганізацый, пра яго ўдзел у стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Акадэміі навук БССР, членам якой ён становіцца ў 1928 годзе, пра ягоную працу ў літаратурна-выдавецкім аддзеле Наркамасветы БССР.

За гэтыя гады выходзяць у свет некалькі зборнікаў яго вершаў, і двойчы—збор твораў (трэцяе выданне не было закончана—перашкодзіла вайна). Многія яго творы перакладаюцца на мовы братніх народаў СССР.

НАВІНКІ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

Ілюстрацыі мастака Вячаслава Тарасава да кнігі «Нанцюрн» Аркадзя Марціновіча.

Надрукавана ў «Маладосці»

КНІГА ЯШЧЭ Ў ДАРОЗЕ...

Рэцэнзіі пішуцца, як вядома, на выдадзеныя кнігі. Паспрабуем парушыць звычай — выкажам свае думкі пра кнігу, якая яшчэ не выйшла, пра кнігу ў дарозе...

У двух нумарах часопіса «Маладосць» (№ 3 за 1967 г. і № 6 за 1968 г.) надрукаваны дзве нізкі вершаў Васіля Зуёнка, якія, відаць, і стануць асновай новага зборніка паэта.

Першае, чым спыняе нашу ўвагу лірыка В. Зуёнка, — сонечнасць, прамяністасць. Паэт упарта імкнецца здабыць сонца, дзе б яно ні было.

Прыгадаем адзін з вершаў, якім Зуёнак дэбютаваў у «дарослай» паэзіі:

Не ад сонца ідзём у глыбіні—
Па сонца ідзём.
Сонца гіне:
Ў кайданы крышталёў
закута—
Ляжыць у падземных
закутках.
Ідзём—
магутныя—
Вызваліць брата
З-за кратаў.

Гэты «паход» мае значэнне сімвалічнае, бо гаворка тут не проста пра салігорскіх шахцёраў, а пра ўсё наша пакаленне, пра сучаснікаў, якія штодзённа змагаюцца за ажыццяўленне сваіх высакародных і чыстых, сапраўды сонечных ідэалаў.

Варочаем,
узнімаем пластамі
Сонца, што камянела вякі.
Смялей ступайце над намі,
Смялей,
землякі!

Дарэчы, вось гэта «ступайце над намі» не хацелася б успрыняць у сэнсе пакутніцкай самаахвярнасці. Маўляў, мы з захапленнем пакладзём усе сілы, нават жыццё, толькі б здабыць сонца-шчасце вам, патомкі. Наш гуманістычны кодэкс, які стаў нормай паводзін і самаадчування мільёнаў, мае сваёй асновай такое зліццё «майго» і агульнага, калі ўсё, што мы робім, на карысць усіх, у імя нашай грамадскай мэты, прыносіць глыбокае **асабістае** задавальненне кожнаму. Таму, прызнацца, і трохі насцярожыла ў вершы з сімвалічным адценнем гэтае «ступайце над намі».

Мабыць тое самае «інтуітыўна» адчуў і сам паэт, бо ўжо ў новым лірычным цыкле ўдакладняе пазіцыю:

...не раю
круціць з мяне віткі.
Запішыце—
у маякі!
Не ў такія, што высяцца
з пыхай
Сонцам слыць у бясхмарны
дзень.
А ў такія, што свецяцца ціха,
Нібы праўда,—
У сэрцах людзей.
Хто збалелы—надзеяй сагрэю,
Хто зняверыўся—узвалаку
Аж да сонца!—па звонкіх
рэях,
Хто зблудзіўся—падам руку.

Вось яно, вялікае прызначэнне чалавека і паэта, — не прыніжаючы і не ўзвышаючы сябе, нязменна, «кругласутачна», падобна маяку, «свяціць» людзям:

Я нязменна,
бяссонна гукаю
Вас усіх
на святло маяка...

«Сонечнасць» В. Зуёнка мае трывалыя традыцыі ў беларускай паэзіі. Мы добра памятаем, якім «сонцапаклоннікам» быў Купала. «Сонечная» тэма хвалюе і многіх сучасных паэтаў — А. Вялюгіна, С. Дзяргая, Я. Сіпакова. Але самым паслядоўным «культавіком» сонца, святла сярод іх з'яўляецца, бадай што, В. Зуёнак. Невыпадкова яго «Крэсіва» нагадала В. Караткевічу, аўтару рэцэнзіі на першы зборнік паэта, адзін з твораў казачніка Андэрсана, у якім салдат набыў крэсіва: стукнеш ім — і збудзецца самае неверагоднае.

Вось тут мы падышлі і да другой асаблівасці лірыкі В. Зуёнка: да яго казачнай умоўнасці, якая ўмее змяняць знешнія, «зманлівыя» абрысы рэчаў і з'яў дзеля выяўлення іх сутнасці.

Гэта казачная ўмоўнасць Зуёнка па-свойму звязана з тымі ж анімічнымі вераваннямі нашых продкаў, з мастацкім мысленнем народа.

Вядома, што з развіццём навукі гэтыя вераванні ўсё больш і больш адміраюць, але як **паэтычны** матэрыял яны не проста знікаюць з свядомасці новых пакаленняў.

Нават больш, многія сучасныя паэты (ці то свядома, ці інтуітыўна — сутнасці з'явы не мяняе) якраз і імкнуцца ўзнавіць самыя каштоўныя моманты старажытнага мыслення. А для гэтага, як слушна заўважыў адзін украінскі крытык, не абавязкова знізіцца да прымітывізму продкаў; гаворка ідзе аб аднаўленні — і на сучасным узроўні — той свежасці, цэласнасці светаўспрымання, якія зусім не лішнія ў наш, празмерна «рацыяналістычны» век.

Часовыя і прасторавыя суадносіны пераплятаюцца ў Зуёнка. Старыя народныя звычкі перадаюцца праз прызму сучаснага ўспрыняцця, з захаваннем, аднак, іх непаўторнай прывабнасці. Так, у вершы «Успамін» (са зборніка «Крэсіва») адчуваеш не проста асабістыя згадкі аб радзіме, але і такія штрыхі і дэталі, якія, нібы па кодзе, перадаліся з мінулага ў цяперашняе. Нават словы ў паэта адметныя — сакавітыя, набраклыя, здаецца, ён чэрпае іх прыгаршчамі з крынічных глыбінь, з сівой мінуўшчыны.

Васіль Зуёнак неяк неўпрыкметку і з поўным правам парадніўся з прыродаю; яна — родны дом, дзе ўсё такое знаёмае і звычайнае для яго. Прырода ў Зуёнкавых вершах жыве, рухаецца, дыша, як чалавек. Яна спраўляе святы і ў бяду гаруе. Герой Зуёнка захапляецца спевамі траў і кветак. Усе яны, нібы жывыя істоты: гарох — цар мышыны, ён жа — парфумнік, канюшына — нібы дзяўчына і д. т. п.

Услаўленне па-народнаму здаровага і натуральнага жыцця, бессмяротнай яго пераемнасці, адвечнага кругазвароту ў прыродзе — адзін з пастаянных матываў лірыкі Зуёнка, у прыватнасці — гэта матыў «Фантазіі скошанага лугу»:

Снягі...
Над мурагом каровы
Вясною трызняць маладой,
Нясуць унучкам ружовым
Залеву красак —
сырадой...
Гаркавіць чадам летнім ложак,
Мілуюць жонак мужыкі,
І сноў дзявочую трывожнасць
Люляюць ціха
сеннікі...

Народныя абрады, звычаі, святкаванні — паэт нібы хоча ўзрадзіць нанова іх непаўторную прывабнасць; ён прасочвае пераемнасць традыцый: што мы зберaглі з мінулага? Традыцыйнае, навет абрадавае напаўняецца ў лепшых творах Зуёнка **сённяшнім** пачуццём закаханага юнака да дзяўчыны.

Вось, напрыклад, верш пра саракі — веснавое свята спадзяванняў і мар беларусаў:

Вылятаюць
сорак выраяў,
сорак стрэл пасылае.
Чараўніцы з надзеяй шчыраю
Аж пад неба
вясну люляюць.
Замаўляюць добрай сілаю
Маладзецкую сілу лютую:
Хай адзін галубіць ды мілуе,
Сорак сохнуць хай ды
пакутуюць.
Саракі...
Гайданка да вечара
На блакітных звонкіх арэлях;
Тугой—на сэрцы хлапечыя,
На дзявочыя—
шчаслівым вяселлем,—
Сорак вяровак
парваць,
Сорак галоў зламаць.
Саракі...

Чаго яшчэ, на нашу думку, не хапае Зуёнку? Галоўным чынам умельства арганічна, не здраджваючы сваім індывідуальным творчым схільнасцям, не парываючы са светам прыроды і казкі, а «знутры» гэтага свету, пераключыцца на тэму гісторыі, зразуметай не толькі як мінулае, але перш за ўсё як сучаснасць, як сённяшні дзень.

Тое, што Зуёнак пакуль зрабіў у гэтым сэнсе, на жаль, не можа нас парадаваць ні колькасцю, ні якасцю. Нават вершы пра вайну, што засталася ў памяці маладога паэта, стаяць на відавочна ніжэйшым узроўні за тыя, дзе пераважае неверагодна-казачнае і ўмоўнае.

Так, халаднавата-штучным, неяк «зададзеным» здаецца мне верш Зуёнка «Дзень і ноч, дзень і ноч...» — пра ўдоў ваеннага часу, верш, нанізаны на стрыжань аднаго слова — «прыгавор»: «Смерць пісала мажным, чорнабровым... прыгавор неадвержны: «Удовы»... «прыгавор — упрагацца ў плуг»; «прыгавор — на няроўны бой» і г. д.

Наогул можна заўважыць, што Зуёнак нярэдка «забівае» сябе словамі, як бы не давярае перажыванню і пачуццю, іх здатнасці праявіцца ва ўсёй натуральнасці і прастаце. І яшчэ тое, што паэт яўна злоўжывае занадта «высокімі», празмерна ўрачыстымі тропамі, і зноў жа там, дзе гаварыць павінны толькі шчырасць і непасрэднасць.

«Прыйдзі, як песня, што табе збярог бацькоўскі край...», «Прыйдзі, як думкі вогненнай усплёск, як гром ракет, што ўзлёт твой акрыляў», — нашто гэта ўсё ў вершы, задуманым як зварот да **сына?..**

Будзем спадзявацца, што, складаючы новы зборнік, Васіль Зуёнак будзе няўхільна трымацца ўзроўню лепшага ў сваёй творчасці і што зборнік будзе варты яго таленту і магчымасцей.

І. ШПАКОЎСКІ.

ПРА КАЗАХСКА-БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Інстытутам літаратуры і мастацтва імя М. Ауэзава Акадэміі навук Казахскай ССР падрыхтаваны бібліяграфічны даведнік у трох тамах: «Казахская савецкая літаратура (1917—1945 гг.)», «Казахская савецкая літаратура (1946—1964 гг.)» і «Казахскія літаратурныя сувязі (1917—1967 гг.)». Трэці том днямі атрыманы Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У. І. Леніна.

У даведнік «Казахскія літаратурныя сувязі» ўключана бібліяграфія навукова-тэарэтычных і літаратурна-крытычных артыкулаў, даследаванняў па праблемах сувязей казахскай літаратуры з іншымі літаратурамі, а таксама перакладаў мастацкіх твораў на казахскую і з казахскай мовы.

Для беларускага чытача найбольш цікавы раздзел бібліяграфіі «Сувязі казахскай літаратуры з беларускай». У пачатку раздзела ўказаны артыкулы пра беларускую літаратуру з казахскага друку. Далей ідзе персанальная падборка. У ёй пералічваюцца вершы П. Броўкі, апублікаваныя ў 1955—1962 гадах у казахскім перыядычным друку; артыкулы пра Якуба Коласа і пераклады твораў народнага паэта на казахскую мову, надрукаваныя ў 1936—1962 гадах; перакладаў твораў А. Куляшова; артыкулы пра творчасць Янкі Купалы ў казахскім друку 1935—1957 гадоў і пераклады яго вершаў на казахскую мову; пераклады вершаў М. Танка, апавядання Я. Брыля «Ветэрынар», байкі У. Корбана «Сваццяя», рамана І. Шамякіна «Глыбокая плынь». У гэтым спісе няма, чамусьці, кнігі Т. Хадкевіча «За сінім лесам», якая выйшла на казахскай мове ў 1950 годзе.

Далей ідзе пералік публікацый і выданняў твораў казахскай літаратуры ў Беларусі: кніга вершаў Джамбула, выдадзеная на беларускай мове ў 1939 годзе, і яго вершы, апублікаваныя ў 1938 годзе ў часопісе «Полымя рэвалюцыі»; вершы А. Абая ў перакладзе А. Астрэйкі з «Полымя» за 1954 год; вершы Джансугурава, перакладзеныя М. Хведаровічам у 1936 годзе; пераклады вершаў Ж. Жуманава, С. Мауленава, Дж. Мулдагаліева, Г. Арманава, С. Сейтава. У даведніку зарэгістраваны пераклады з казахскай мовы, зробленыя А. Астрэйкам, М. Хведаровічам, А. Жаўруком, А. Зарыцкім, Ц. Крысько (В. Віткам), П. Кавалёвым, С. Шушкевічам.

Не ўказаны толькі, чамусьці, пераклады казахскіх казак, апублікаваныя на беларускай мове ў кнізе «Казкі народаў свету» (Мінск, ДВБ, 1954), і асобнае выданне казахскіх казак «Хітрэц Алдар-Кос» (Мінск, ДВБ, 1938).

Н. ВАТАЦЫ.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Канстанцыя Буйла. У бляску зор. Вершы. Мастак Ю. Зайцаў. 1968 г. Тыраж 8.000 экз. 24 стар. Цана 7 кап.

Віталь Вольскі. Падарожжа па краіне беларусаў. Мастакі П. Драчоў і В. Ждановіч. 1968 г. Тыраж 10.000 экз. 280 стар. Цана 52 кап.

Ніл Гілевіч. Лісце трыпутніку. Выбраныя творы. Мастак Б. Забораў. 1968 г. Тыраж 7.000 экз. 256 стар. Цана 90 кап.

Іван Дзядзюля. Лясная гвардыя. Запіскі былога камісара партызанскай брыгады «Смерць фашызму». Мастак С. Раманаў. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 75.000 экз. 312 стар. Цана 70 кап.

СЯГОННЯ ГЭТА МОЖНА СКАЗАЦЬ...

Аркадзю МАЎЗОНУ—пяцьдзесят гадоў

Спаўняецца 50 гадоў беларускаму драматургу і кінасцэнарысту Аркадзю Маўзону. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала юбіляру прывітанне:

«Дарагі Аркадзь Іосіфавіч!

Мы, Вашы шматлікія сябры, ад шчырага сэрца віншуем Вас, майстра беларускай драматургіі і кіно, са слаўным юбілеем — пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння.

Створаная Вамі гераічная драма «Канстанцін Заслонаў» — выдатнае дасягненне ў гэтым жанры не толькі ў нашай, але і ва ўсёй шматнацыянальнай драматургіі. Яна абышла сцэны амаль усіх тэатраў краіны.

Вы па-майстэрску напісалі гэты твор для экрана і бессмяротны вобраз Канстанціна Заслонава пайшоў далёка, з краю ў край, выхоўваючы ў людзей мужнасць і гераізм у барацьбе супраць імперыялістычных агрэсараў.

Шырокую вядомасць набылі Вашы п'есы «Пад адным небам», «Куды ідзеш, Сяргей?», «У цiхім завулку», «У бітве вялікай». Ідуць з поспехам на экранах фільмы па Вашых сцэнарыях — «Зялёныя агні», «Наперадзе круты паварот».

Вы, дарагі Аркадзь Іосіфавіч, знаходзіцеся ў росквіце творчых сіл, і мы жадаем Вам бадзёрага настрою, моцнага здароўя і новых поспехаў у тэатры і кіно».

Рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва» далучае да гэтага прывітання свае шчырыя пажаданні доўгіх і шчаслівых гадоў, маладосці і добрых адносін з музамі.

Я пачуў пра Аркадзя Іосіфавіча ў 1946 годзе, калі паступіў у студыю пры тэатры імя Якуба Коласа. Ён ужо паспеў быць артыстам і прыйшоў у драматургію, а я толькі-толькі пачынаў. Але калі мы пазнаёміліся, між намі адразу ўзнікла ўзаемная сімпатыя, якая потым захавалася на доўгія гады. Так ужо здарылася ў жыцці, што калі праз некалькі гадоў мяне запрасілі ў Мінск, у тэатр імя Янкі Купалы, дык адна з першых маіх роляў была ў п'есе Маўзона «Твой светлы шлях», а ў кіно мая першая роля — самая першая — у фільме «Наперадзе круты паварот» па сцэнарыі Аркадзя Маўзона.

Ён заўсёды раўніва сачыў за маім лёсам, за маім творчым ростам і дапамагаў мне то востравым словам, то добрай парадай. Я ніколі не задумваўся, колькі гадоў Аркадзю Іосіфавічу. Ён здаваўся мне маладым. Ён і сёння малады. Ён у тым шчаслівым узросце, калі ты ўжо даволі многа пабачыў у жыцці, даволі многа зразумеў, а наперадзе ў цябе яшчэ доўгая дарога.

Я ўспамінаю, з якім задавальненнем працаваў над вобразам Канстанціна Заслонава. І як Аркадзь Іосіфавіч самааддана перапісваў сцэны, імкнуўся, каб п'еса, напісаная два дзесяткі гадоў назад, загучала сёння сучасна, хвалявала, была патрэбна новаму, падрослшаму пакаленню.

Рэдка, зельмі рэдка гаворым мы адзін аднаму добрыя словы. Але сёння, калі майму сябру, майму настаўніку спаўняецца пяцьдзесят, я хачу на ўвесь голас сказаць яму, што люблю яго, люблю, калі ён насуплены, калі грамавым голасам кідае дасціпнасці, люблю яго сарказм, яго душэўнасць.

Я і мае сябры па тэатры, якія ведаюць і любяць Аркадзя Іосіфавіча не менш за мяне, спадзяемся, што ў нас наперадзе цікавыя творчыя сустрэчы, і не толькі творчыя.

Мікалай ЯРОМЕНКА,
народны артыст БССР.

Сёлета тэатр імя Якуба Коласа прыняў да пастаноўкі маю п'есу пра дзейнасць падпольшчыкаў Віцебска ў час Вялікай Айчыннай вайны. Умоўна я назваў яе «Жывыя, не забудзьце!».

Работа над п'есай працягваецца.

Прапаную чытачам урывак з гэтай п'есы.

ЖЫВЫЯ, НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ!

Аркадзь Маўзон

...Партызанская зямлянка. У ёй падпольны гарком партыі. У зямлянцы—Гудзінаў, Нягібаў, Жэня, Федзя, бацька і яшчэ некалькі чалавек.

ГУДЗІНАЎ (*пасля паўзы*). Паўлік, Паўлік, Паўлік... Не называць цябе Паўлам Пятровічам... І не напішаш у аўтабіяграфіі — з дзевяці месяцаў удзельнічаў у барацьбе... (*Цяжка ўздыхае, закурвае.*) У іх смерці вінаватыя і мы... Так, мы. Парушылі дысцыпліну, дысцыпліну канспірацыі... Да нас прабраўся правакатар. Самае страшнае для нас.

Вялікая паўза.

ФЕДЗЯ. Іх вывелі на Ленінскую... Вялі басаніж, акрываўленых, збітых... На кожным фанерка з надпісам — «Мы бандыты, дапамагалі партызанам...» Павесілі на Смаленскай плошчы... Першым — малога. Затым Старую і ўсіх астатніх. Апошняй Ясную... Ужо з пятлёй на шыі яна паспела крыкнуць: «Жывыя — адпомсціце».

ГУДЗІНАЎ. Адпомсцім, вядома. І за кожнага. (*Пасля паўзы.*) Правакатара выявіць і знішчыць. Што б там ні было — знішчыць. І гаспадара гэтай бруднай анучы (*паказвае на газету*). Чыталі, што вярзе: «Можна не сумнявацца — насельніцтва нашага горада, вызваленае ад бальшавіцкага прыгнёту, толькі парадуецца знішчэнню фанатыкаў-падпольшчыкаў, скажа дзякуй нямецкім уладам за іх імкненне навесці ў горадзе парадак».

БАЦЬКА. І от жа ж таксама наш хлеб еў... Нашым паветрам дыхаў...

ГУДЗІНАЎ. Хопіць яму дыхаць... (*Злосна камячыць газету*). Хопіць!..

ФЕДЗЯ. Я яго ведаю. Ён у нас у школе, выкладаў рускую літаратуру і мову... Здорава, паллюга, выкладаў... Я яго... Я любіў яго ўрокі... Выкананне прыгавору прашу даручыць мне... Здамо яму... Яшчэ раз здамо яму экзамен. Апошні...

БАЦЬКА. Правільна сынку...

ФЕДЗЯ. Так яго раскідаю, што... Прашу гэта даручыць мне...

ГУДЗІНАЎ (*туліць Федзю да сябе. Пасля паўзы*). Калі б не вайна, куды вучыцца пайшоў бы?

ФЕДЗЯ. Не разумею.

ГУДЗІНАЎ. Кім збіраўся быць? Калі б не вайна?

ФЕДЗЯ. Хацеў палярнікам... зімоўшчыкам...

ГУДЗІНАЎ. Палярнікам... Слава Шміта, папанінцаў спаць не давала... Харошая, цікавая работа і прафесія самая мірная...

ФЕДЗЯ. Але цяпер вайна... І кожны, хто можа, павінен...

ГУДЗІНАЎ (*не адразу*). Ён цябе вучыў... Яго знішчаць хлопцы з атрада... Ты ім... ты... Ты, хлопча, пакажаш ім яго...

ФЕДЗЯ. Але...

ГУДЗІНАЎ. Як зробіце ўсё, ты разам з хлопцамі вернешся сюды... Нельга табе больш заставацца ў горадзе... (*Паглядзеў на дзяўчыну.*) Разам будзеце.

Дзяўчына сумелася, Гудзінаў усміхнуўся.

Каб не забыць — скрыпач твой — ужо на Вялікай зямлі... у Маскве...

ФЕДЗЯ. Перапpавілі?

БАЦЬКА. А як жа. Першым жа самалётам... Не хацеў ён... Крычаў — я партызан, не маеце права. Паляцеў. Будзе там вучыцца, стане музыкантам... Скончыцца вайна — усе збяромся на яго выступленне... І вы, жэўжыкі, як скончыцца вайна, пойдзеце вучыцца. Дасягнеце, чаго хацелі.

ГУДЗІНАЎ. Вернемся ў сёння... (*Бацьку.*) Дакладвай...

БАЦЬКА. Ага... Значыць, вось што. Ёсць заданне Масквы, камандавання, партызанскага штаба — узяць пад наш кантроль дарогу на Ленінград. Заданне ўсім зонам. Задача — скаваць рух нямецкіх эшалонаў на Ленінград. Дрэнна там, браточкі, у Ленінградзе. Акружыў яго немец... І наш абавязак хоць чым-небудзь Ленінграду дапамагчы... Вось так... і ўвесь даклад.

ГУДЗІНАЎ. План—калі, як, што — у дэталях будзе гатовы пазней... Тады кожны і атрымае свой участак, сваё канкрэтнае заданне... Усё. (*Нягібаву.*) Ты застанься. Астатнія могуць пайсці...

Першымі ўсхокваюць і выбягаюць Жэня і Федзя. Следам, смеючыся, выходзяць астатнія.

(Гудзінаў не спяшаючыся закурвае, частуе Нягібава і пасля вялікай паўзы.)

Ну, выкладвай, што мучае... Па вачах тваіх бачу — мучае. Што?

НЯГІБАЎ (*не адразу*). Загадка адна мучае...

ГУДЗІНАЎ. Якая загадка?

НЯГІБАЎ. Калі іх вялі... Апошні раз, калі вялі... Ясная мяне ўбачыла — крыкнула: Шарык... і Старая... таксама—Шарык... Дурню зразумела — хацелі папярэдзіць — хто іх прадаў... і — Шарык. Што гэта?.. Няма сярод нашых нікога з такой клічкай... Я ўсіх ведаю...

ГУДЗІНАЎ. Усіх ведаеш?

НЯГІБАЎ. Усіх... Ясная неяк пазнаёміла мяне з адным чалавекам... Наш. З мясцовых. Быў у палоне, у лагеры. Збег... Гаварыла, перад вайной разам працавалі... Таксама быў камсамольцам... І аб ім падумаў. Можа ён. Але яго таксама ўзялі. Сядзіць ён. У Эс-Дэ...

ГУДЗІНАЎ. Адкуль ты ведаеш, што ён у Эс-Дэ?

НЯГІБАЎ. Як узялі Ясную, папярэдзіць яго хацеў... Пайшоў да яго... Не знайшоў. У пакойчыку ўсё дагары нагамі... Відаць, вобыск быў... Ну і...

ГУДЗІНАЎ. Сам пайшоў. Адчаяную храбрасць усё дэманструеш...

НЯГІБАЎ. Дык жа ж... Мяркуючы па тым, што апроч Яснай і Старой пакуль нікога з нашых не кранулі — той хлопец правільны...

ГУДЗІНАЎ. Але ж павесілі Ясную і Старую... Ён яшчэ жывы... (*Пасля паўзы.*) Шарык...

НЯГІБАЎ. Шарык...

ГУДЗІНАЎ. Шарык. Шарыкам таго сабаку клікалі, ну што ў Яснай на двары матляўся. Такі кудлаты, рыжы сабака... Але ж сабака не мог...

НЯГІБАЎ (*не адразу*). Кудлаты, рыжы (*устае*). Рыжы... (*Вялікая паўза.*) Рыжы... Ну так, так, мы з ёй назвалі яго для сябе... Рыжым. Так... (*Імкліва ідзе да выхаду.*)

ГУДЗІНАЎ. Стой! Куды?

НЯГІБАЎ. Я ідыёт... Пень... Аглобля... Ён! Ён прадаў...

Зямлянка знікае ў цемры...

У святле—пакойчык Высокага. На стале—нямецкая свяча-газоўка. На падлозе—гурба рэчаў: сукенкі, паліто, дзіцячыя трусікі, пара новых ботаў і шмат чаго яшчэ.

На ложку — чырвоны патэфон, пачак пласцінак. Усё гэта Высокі разбірае, пхае ў даволі поўны ўжо мяшок... Нешта заўважыў на адной сукенцы, паднёс да свячы, разглядае. І чуцен яго голас, як думкі ўслых.

ВЫСОКІ. Чорт! Кроў і на самым бачным месцы. (*Адкідвае сукенку ўбок. Некаторы час «працуе» моўчкі. Мяшок набіты. Ён яго завязвае, скідвае свае боты, нацягвае чужыя.*) Ну так, усё. Парадак. (*Закурвае.*) І сёння ж... быў і няма. Нельга, нельга тут больш заставацца. Фрыц не заб'е — партызаны звядуць... Раздушаць, як вош. А я не вош... Схаваемся як-небудзь, ушыемся ў якую-небудзь дзюрачку... Ненавечна ж гэтае ліхалецце... Возьме верх фрыц — і пры ім паветра хопіць. Прагоняць яго — Расія вялікая, знойдзем зацішны куточак... Толькі б цяпер выкруціцца... А там... (*кідае акурак, заўважае патэфон, хацеў быў сунуць яго ў мяшок. Перадумаў. Накруціў, паставіў першую, якая трапілася пласцінку — «Синий платочек»... некаторы час слухае.*) Гм...—хто гэта яе так любіў, гэтую пласцінку... Яна... (*Рыўком здымае.*) Яна... танцаваць пад яе любіла ў клубе... і з табой. Як яна сказала — рыжы сабака, падохнеш сабакам... (*Ламае пласцінку, кідае на падлогу, трушчыць нагамі.*) Я... я не падохну... Не! Ты! ты... Цябе ўжо няма, а я ёсць! Вось ён — я! А цябе няма і не будзе... А я—буду! (*Закрывае патэфон, таксама суе яго ў мяшок, апранае паліто, бярэ мяшок. Хацеў пагасіць свячу.*) Не! Няхай гарыць. Да канца дойдзе. агеньчык яшчэ за што ўчэпіцца і ўсё... усё агнём пойдзе. (*Абкладвае свячу ашмоткамі газеты.*) І ўсе сляды... Няма, не будзе слядоў, і я... нібыта і я тут згарэў...

Ідзе да выхаду, на долю хвіліны знікае і ўжо адступае спіной назад, бо на яго ідзе Нягібаў.

НЯГІБАЎ. Далёка сабраўся?..

ВЫСОКІ. А гэта я... У вёску... ага... Памяняць сёе-тое... Здароў... уваходзь...

НЯГІБАЎ. Увайшоў.

ВЫСОКІ. Памяняць... Захварэў... Відаць, адбілі мне фрыцы лёгкія... Так у грудзях... Сала, масла кавалак хацеў...

НЯГІБАЎ. Адмяніць давядзецца паход. Справа ёсць. Заданне гаркома...

ВЫСОКІ. Гаркома? Ага... Якое, якое заданне?

НЯГІБАЎ. Збіраемся тое-сёе ўзяць у Гарадской управе. Пойдуць —я, ты, яшчэ тры чалавекі... Актыў...

ВЫСОКІ. Ясна... А калі?

НЯГІБАЎ. Паслязаўтра... ноччу.

ВЫСОКІ. Паслязаўтра?.. Ясна. Ёсць!

НЯГІБАЎ. Так што ў вёску іншым разам.

ВЫСОКІ. Ну, якая вёска. Канечне, калі заданне, вядома...

НЯГІБАЎ. Што ў цябе—«наган», «вальтэр»?

ВЫСОКІ. «Вальтэр».

НЯГІБАЎ. «Вальтэр» — дрэнь. Можа падвесці... (*Вымае з кішэні «тэ-тэ».*) Махнём?

ВЫСОКІ. А ты з чым застанешся?

НЯГІБАЎ. У мяне во (*ляпае па аўтамаце*). Ну!..

ВЫСОКІ. Гм... яно... (*вымае «вальтэр».*) Махнём... (*забірае ў Нягібава «тэ-тэ», аддае яму «вальтэр»*). Цацачка...

НЯГІБАЎ. Ты — асцярожней. Поўная абойма. (*Хавае ў кішэнь «вальтэр», падымае аўтамат.*) А цяпер— рукі!

ВЫСОКІ. Што?

НЯГІБАЎ. Падымі рукі...

Высокі спалохана падымае рукі, але тут жа страляе ў Нягібава. Стрэлу няма. І тады ён пачынае адступаць. Зачапіўшыся за мяшок, ледзь не падае.

Я ж табе казаў — асцярожней... (*Паказвае на мяшок.*) Развяжы. Усё, што нахапаў сюды. Ну...

Высокі, не зводзячы вачэй з аўтамата, развязвае мяшок, вывальвае ўсё на падлогу.

Прадаваў жывых, рабаваў мёртвых...

ВЫСОКІ. Не... што ты... Усё маё, бацькоў, шчэ даваеннае...

НЯГІБАЎ. Прадаваў. Каб самому застацца ў жывых... Заўтра прадаў бы мяне. Прадаваў бы яшчэ і яшчэ...

(Заканчэнне на 4-й стар).

А што гэта за галерэя фотапартрэтаў? Гэта здымкі людзей, якія сталі правобразамі герояў паэмы «Над ракою Арэсай», своеасаблівага паэтычнага рэпартажу Я. Купалы аб людзях Палесся. Івана Дамінікавіча глыбока цікавілі новыя працэсы, якія адбываліся ў грамадстве і гаспадарцы, у горадзе і вёсцы. Ён часта ездзіў па рэспубліцы, вывучаў новае жыццё. Вынікамі гэтых паездак з'явіліся паэма «Барысаў» і зборнік вершаў «Песня будаўніцтву».

Шмат у нас матэрыялаў, якія расказваюць аб дружбе Купалы і Горкага, Купалы і Коласа. Асабліва зблізіліся Горкі і Купала ў час Першага з'езда савецкіх пісьменнікаў у 1934 г. Аляксей Максімавіч пасля з'езда запрасіў беларускую дэлегацыю на сваю дачу ў Горкі. На фотаздымку, які быў зроблены пад час сустрэчы, побач з М. Горкім—Я. Купала, Я. Колас, М. Лынькоў, А. Александровіч, П. Галавач, М. Клімковіч і І. Харык.

У 1936 годзе ён удзельнічае ў рэдагаванні Канстытуцыі СССР і Канстытуцыі БССР. У 1939 годзе Янка Купала разам з лепшымі пісьменнікамі Савецкага Саюза ўзнагароджваецца ордэнам Леніна.

У 1940 годзе народ выбірае Янку Купалу дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР па Лідскай выбарчай акрузе. У 1941 годзе за зборнік «Ад сэрца» яму прысуджаецца Дзяржаўная прэмія першай ступені. У экспазіцыі, прысвечанай гэтым падзеям, экспануюцца партрэты Я. Купалы і К. Крапівы—першых беларускіх лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, напісаныя адным са старэйшых беларускіх мастакоў А. Заборавым.

А цяпер сыдзем уніз, у апошнія залы музея.

1941 год. Здымкі і карціны знаёмяць з перадваеннымі паездкамі паэта ў Рыгу і Вільнюс, дзе адбываліся дзелавыя пасяджэнні, сяброўскія сустрэчы, новыя знаёмствы. У Вільнюсе і застала Івана Дамінікавіча вайна.

Па сваіх гадах і стану здароўя паэт не мог узяць у рукі зброю. Ён змагаецца з ворагам пяром, сваімі творамі. Палымяныя артыкулы і вершы народнага песняра клічуць савецкіх людзей на свяшчэнную барацьбу з ворагам. У адной з залаў сабраны партызанскія лістоўкі з вершам «Беларускім партызанам», нумары газет «Правда», «Известия», «Красная звезда», франтавых і падпольных газет. І ў кожным выданні—яго артыкулы, выступленні, вершы, палымянае слова паэта, якое будзіла нянавісць да ворагаў, падымала баявы дух байцоў.

1942 год. Масква. Тут 28 чэрвеня трагічна загінуў Купала. Урна з яго прахам была захавана ў калумбарыі крэматорыя. У дні васьмідзесяцігоддзя Янкі Купалы прах паэта быў перавезены ў Мінск і пахаваны на Даўгабродскіх могілках. Пастамент і копія ўрны, вянкі і жалобныя стужкі захоўваюцца ў музеі. Кожны, хто наведвае музей, падоўгу спыняецца тут.

Купала застаўся жыць у справах свайго народа, у сваіх творах. Яго імем названы вуліцы, школы, бібліятэкі, тэатр, інстытуты. Разам са сваім народам ён крочыць у будучае. Пра гэта—апошняя зала музея.

Вось тэатральны куток залы. Тут—эскізы мастацкага афармлення спектакляў па купалаўскіх творах, афішы шасцісотага паказу «Паўлінкі» на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, «Раскіданага гнязда» ў тэатры імя Якуба Коласа, фота з пастановак «Паўлінкі» прафесіянальнымі і аматарскімі калектывамі ў Рызе, Бабруйску, Беластоку, Ашмянах і многіх іншых месцах.

Надзвычай багата прадстаўлена ў музеі купаліяна. Творчасць Купалы аказала ўплыў на выяўленчае мастацтва, музыку, тэатр. У нас выстаўлена цэлая партрэтная галерэя паэта, напісаная яго сябрамі—беларускімі і рускімі мастакамі. Ёсць «зашпалерны партрэт» песняра (людзі хавалі яго ад дэфензівы за шпалерамі), напісаны заходнебеларускім мастаком. Многа ў нас малюнкаў і кампазіцый, у якіх раскрыты старонкі біяграфіі паэта, сюжэты яго твораў. Нельга не любавацца разьбой па дрэве і косці, партрэтам Купалы з каляровай саломкі работы В. Дзегцярэнкі, шматлікімі вышыўкамі і інкрустацыямі.

У нас багацейшы збор музычных твораў, напісаных на творы паэта. Згодна міжнародных даведнікаў па музыцы, наш пясняр увайшоў у першую дзесятку паэтаў, на словы якіх больш усяго напісана музыкі. Акрамя Купалы ў гэтую дзесятку ўваходзяць Пушкін, Лермантаў, Някрасаў, Шаўчэнка, Гейнэ, Шэкспір, Міцкевіч, Ясенін, Райніс.

Цікава будзе ведаць чытачам і пра тую вялікую збіральніцкую работу, якую вядуць нашы навуковыя супрацоўнікі. Я ўжо гаварыў, што ў Мінску мы адшукалі частку бібліятэкі «Веды»—кнігі, якія Купала трымаў у руках, рабіў выпіскі з іх. З Украіны намі атрымана звыш 500 рукапісаў паэта розных гадоў, з Вільні і Ленінграда—рэдкія дарэвалюцыйныя выданні: кнігі, часопісы, газеты. Чэхаславацкія таварышы перадалі ў музей рэдкую калекцыю фота, газетных, кніжных і часопісных матэрыялаў, якія звязаны з жыццём і творчасцю Я. Купалы. Музей падрыхтаваў зборнік «Янка Купала ва ўспамінах сучаснікаў», у якім сабрана больш 50 успамінаў пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, навуковых работнікаў, партыйных і дзяржаўных дзеячоў.

Збіральніцкая праца супрацоўнікаў музея спалучаецца з навукова-даследчай. Рыхтуюцца зараз III і VI тамы бібліяграфіі твораў Купалы, выдадзеных з 1942 года па 1960 год на роднай мове, на мовах народаў СССР і замежных краін. Упершыню асобна будзе выдадзена поўная бібліяграфія па купалазнаўству з 1905 па 1960 г. Выдадзена 6 купалаўскіх зборнікаў дакументаў, успамінаў, даследчых прац, папулярызатарскіх матэрыялаў і твораў, прысвечаных Купалу. Зараз падрыхтаваны зборнік навукова-даследчых прац, прысвечаных жыццю і творчасці Я. Купалы дарэвалюцыйнага часу. Дырэктар музея Я. Шарахоўскі напісаў першую навуковую біяграфію Я. Купалы. Створаны манаграфіі—І. Жыдовічам «Янка Купала—публіцыст» і аўтарам гэтых радкоў—«Янка Купала і беларускі тэатр». Музеем выдаваліся купалаўскія плакаты, даведнік і буклет, лістоўкі. Зараз навуковыя і фондавыя супрацоўнікі працуюць над тэкстамі і каментарыямі да іх, над складаннем новага збору твораў Я. Купалы...

І вось мы зноў у двары дома паэта. Вакол яго—вялікі парк. У гэтым парку будзе пастаўлены помнік народнаму паэту БССР Янку Купалу—непадалёк ад купалавага дома, куды ніколі не зарасце народная сцяжына.

Алесь ЕСАКОЎ,
вучоны сакратар Літаратурнага музея Я. Купалы.

ЦЫРК

ВОСЕМ СЦЯГОЎ НА МАНЕЖЫ

Як толькі жоўты ліст пачынае падаць на зямлю, у Мінскім цырку перастаюць «круціць» старыя карціны, і ўвесь ён асвятляецца каскадамі рэкламных агнёў. Пачынаецца новы сезон, свята яркіх фарбаў, сілы, спрыту, прыгажосці і мужнасці.

Сёлетні сезон у Мінскім цырку адкрывае Міжнародная праграма.

Пад срабрыстыя гукі маршу ў шаўковым плёскаце рознакаляровых сцягоў выходзяць на манеж артысты Балгарыі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Манголіі, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, Савецкага Саюза. Ляцяць пад купал радкі пралогу:

Сягоння з вамі рады
прывітацца
Артысты — пасланцы сваіх
краін.
Прадэманструюць вам сваё
мастацтва
Паляк і чэх, балгарын
і румын.
Тут поруч венгры, немцы
і манголы.
Тут поплеч—іх савецкія
сябры.
І хараство, і спрыт, і
смех вясёлы
Прынеслі ў цырк
выдатныя майстры.

Сапраўды, многія нумары праграмы вабяць адточаным майстэрствам.

І перш за ўсё хочацца адзначыць выступленне балгарскіх артыстаў Трончавых — гімнастаў на турніках. Захапляе дакладнасць і зладжанасць іх работы, філігранная апрацоўка трукаў. Цікава і нова для мінскага гледача тое, што артысты ўвялі ў свой нумар лавітара. Але асабліва падабаецца публіцы Трончаў-комік, які робіць складаныя трукі абаяльна, з мяккім гумарам і бліскучым тэхнічным майстэрствам. І пакуль ідзе нумар, глядач паспявае палюбіць гэтага пацешнага малога, такога няўклюднага і разам з тым спрытнага героя ў шырачэзных штанах.

З цікавасцю глядзіцца нумар венгерскіх акрабатаў-вальтыжораў Ачаі. Па форме—гэта закончаная тэатралізаваная сцэнка. Прыстойная сям'я — маці, бацька і сын утульна размяшчаюцца для адпачынку. Бацька ўладкоўваўся ў крэсле. Маці ставіць на стол паднос. І раптам сын робіць на ім стойку, бацька паднімае сына разам з падносам, а калі пад гукі рытмічнага танца на манежы з яўляецца данка—энергічная і неўтаймоўная істота, дык крэсла аказваецца то маленькім батутам, то выдатнай стартавай пляцоўкай, адкуль юная актрыса робіць скачок з двайным сальта ў рукі бацькі.

Уражаюць мноствам новых невядомых да гэтага часу трукавых камбінацый чацвёра Ікарыс з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У вельмі высокім тэмпе працуюць скакуны на падкідных дошках Машаяну з Румыніі. І здаецца, што няма такога труку, які немагчыма было б зрабіць на падкідных дошках, і якога не было б у нумары румынскіх акцёраў.

Аматараў класічнага цырка парадуе паветраны палёт чатырох Энгелас (ГДР) і па-дэ-дэ Тамары і Глеба Лапіяда (СССР)—сапраўдны балет на конях, якія мчацца на сцэне галопам.

Не выкліча ні аднаго папроку нават у самых патрабавальных знаўцаў цыркавога мастацтва работа жакеяў-наезнікаў Сабалеўскіх (СССР).

А вось назваць бездакорным нумар сілавых акрабатаў Мінасяна і Бялова (СССР) — нельга. Відаць, што артысты таленавітыя, іх праграма насычана складанымі трукамі, але няма таго, што можна назваць адным дыханнем у рабоце партнёраў. Іх нумар распадаецца на рад асобных элементаў, няма ў ім кампазіцыйнай стройнасці і цэласнасці.

Часлава Грушкоўскага ў гэтым інтэрнацыянальным калектыве называюць польскім Дуравым. У яго нумары працуюць мядзведзь, певень, галубы, пава, кот і нават тхор! Бліскуча валодаюць усімі сакрэтамі дрэсуры таксама Мірак і Таня Млчакавы з Чэхаславакіі. Яны паказалі выдатную групу малпаў-шымпанзе. Іх выхаванцы на манежы на дзіва паслухмяныя, дабрадушныя і працуюць на турніках, як сапраўдныя цыркавыя акцёры.

У праграме быў і трэці нумар дрэсуры — Каліста Лапіда з групай сабачак-балонак і шпіцаў. І вось тут хочацца сказаць некалькі слоў папроку тым, хто складаў праграму. Некаторыя жанры прадстаўлены ў шкоду іншым. Так, двойчы сустракаюцца ў праграме эквілібрысты на пяршах — Цэрэндулам з Манголіі і Стэльян з Румыніі.

Увесь вечар праводзяць на манежы клоуны—заслужаны артыст Удмурцкай АССР Васіль Арлоў і Іван Трапіцын. Мінчане ўжо сустракаліся з імі чатыры гады назад і таму крыху расчараваны тым, што ў рэпертуары іх да гэтага часу засталіся і «дрэсіраваны асляка», і рэпрыза з матацыклам. Гады ідуць, а жарты тыя самыя. Магчыма, глядач больш цярпіма паставіўся б да нумароў, якія акцёры лічаць сваім «залатым фондам», калі б у новых рэпрызах артысты былі больш спрытнымі.

Але ўсё гэта тыя нямногія хібы, якія лёгка паправіць. У цэлым жа міжнародная праграма пакідае выдатнае ўражанне. І вельмі добра, што свята цыркавога мастацтва, свята сілы, спрыту, прыгажосці ператвараецца кожны вечар на сцэне Мінскага цырка яшчэ і ў свята дружбы!

М. ГАРЭЦКАЯ.

ЗА ДЗЕСЯЦЬ МІНУТ ДА СЕМІНАРА.

Фотаэцюд Э. ТРЫГУБОВІЧА.

ЖЫВЫЯ, НЕ ЗАБУДЗЬЦЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

ВЫСОКІ. Не! Не. Я хацеў пайсці адсюль. З горада. Знікнуць, каб больш ніколі... Клянуся, я... павер мне, я... я каюся... На каленях *(падае на калені)*. Я сам, сам хацеў сябе парашыць, але не магу... Слухай, слухай, ніхто, апроч цябе, нічога не ведае. Я... я дам табе грошы, на... *(Кідае да ног Нягібава грошы.)* Бяры! Я, я яшчэ магу. *(Ускоквае, выхопліває нож, кідаецца на Нягібава, б'е яго, трапляе ў руку.)* На... на!

НЯГІБАЎ. Ах ты, сука збродлівая! *(Страляе.)*

Высокі падае на гурбу рэчаў, на грошы.

ВЫСОКІ. Вось і дзюрачка... *(Памірае.)*

Нягібаў некаторы час глядзіць на Высокага, вымае з кішэні паперку, кладзе яе таму на спіну.

НЯГІБАЎ. Знойдуць цябе тут твае дружбакі, прачытаюць — «Так будзе з кожным, хто супраць нас»... *(І кудысьці ў далячынь.)* Таварыш Гудзінаў, правакатар знішчаны. Па закону — кроў за кроў, смерць за смерць...

Цемра.

Дома ў Бранда, рэдактара газеты «Новы шлях».

За машынкай — Хударлявая.

БРАНД. Друкуй... Мы беларусы. «Мы»—закрэслі. Пішы проста — беларусы...

Хударлявая б'е па клавішах.

...павінны зразумець: зараз на свеце няма такой сілы, якая магла б спыніць пераможнае шэсце германскіх узброеных сіл, германскага духу, германскага генія. Кропка. Напісала?..

Хударлявая ківае галавой.

Беларусы, вы добры, працавіты, ціхі народ. Канчайце з бальшавіцкім, з рускім, маскоўскім прыгнётам. Ганіце ад сябе камісараў. Парывайце з бандыцка-партызанскім збродам і пад магутнай рукой фюрэра — наперад да новага, шчаслівага жыцця... Клічнікі..

Хударлявая, дапісаўшы, моўчкі вымае з машынкі закладку, аддае Бранду. Той, узяўшы ўжо надрукаванае раней, моўчкі чытае...

Так. Салдацкая музыка. Барабанная траскатня. Але генералу спадабаецца. *(Складвае надрукаванае. Уключае прыёмнік.)*

І амаль адразу ж з прыёмніка — істэрычны лямант (на нямецкай мове). Кожнае трэцяе пятае слова Сталінград, Волга, Сталінград.

Лямант канчаецца пад крык «Хайль Гітлер», «Зіг хайль». Потым марш. Бранд выключае прыёмнік.

ХУДАРЛЯВАЯ. Гэтак жа яны крычалі, калі былі пад Масквой.

БРАНД. Яны многа крычаць. І можа здарыцца так, што і Сталінград, яны таксама не возьмуць, як не ўзялі Масквы.

ХУДАРЛЯВАЯ. Тады — навошта ўсё? Нашто столькі крыві, для чаго?

БРАНД. Не ведаю, хаця, асабіста для мяне... Надзея, што будзе знішчаны камунізм, — гэтае заіканне рускіх...

ХУДАРЛЯВАЯ. Я не ўяўляю, што ты іх так ненавідзіш — рускіх.

БРАНД. Усё жыццё. Дарэчы — за апошні час узненавідзеў і некаторых маіх суайчыннікаў. Яны дыктуюць мне, што трэба друкаваць у маёй газеце. Я ўзненавідзеў і сябе, за тое, што павінен слепа ім падпарадкоўвацца... Але нішто. Прыйдзе і мая часіна. *(Паглядзеў на гадзіннік.)* О, так можна і спазніцца... *(Апранае пінжак, ідзе да выхаду.)*

ХУДАРЛЯВАЯ. Чакай.

БРАНД. Што такое?

ХУДАРЛЯВАЯ *(не адразу, ціха)*. Тры дні назад на рынку чула: партызаны проста ў горадзе забілі аднаго. На грудзі паклалі яму запіску: «Так будзе з кожным, хто супраць нас».

БРАНД. А нашто ты мне гэта сказала?

ХУДАРЛЯВАЯ. Я баюся за цябе *(паказвае на партрэт)*. Яшчэ не прайшло і года, як забілі яго.

БРАНД. Ён загінуў як місіянер...

ХУДАРЛЯВАЯ. Яшчэ чула — па ўсёй дарозе на Ленінград, ад Віцебска да Невеля і далей, крушэнні нямецкіх паязноў... Узрываюцца масты... У сваіх лістоўках партызаны пішуць: «Смерць нямецкім захопнікам і памагатым». І подпіс...

БРАНД. Віцебскі падпольны камітэт. Ну і што?

ХУДАРЛЯВАЯ. Можа яшчэ ёсць час адысці ўбок. Мы—настаўнікі. Свой кавалак хлеба...

БРАНД. Мне проста кавалак хлеба мала. І пайшоў я ў той бок, які даўно сабе абраў. І ўсё. Кінем пра гэта — усё будзе добра. А цяпер, калі ласка, паглядзі, ці стаіць на вуліцы вартавы.

Хударлявая выходзіць, вяртаецца.

ХУДАРЛЯВАЯ. Вартавы стаіць.

БРАНД. Ну вось. Усё ідзе добра. І надалей усё будзе добра.

(Выходзіць).

ХУДАРЛЯВАЯ. Дай божа, іначай я звар'яцею. Канчаткова звар'я...

Не паспявае закончыць слова... За акном чуваць стрэл, потым другі...

Забілі...

Святло гасне.

Досвітак. Туман. У глыбіні, за хвойнікам, відаць фермы чыгуначнага моста... Крыху ўбаку—будка для каравульнай каманды.

Паяўляецца і знікае цень вартавога...

Прыгінаючыся, упаўзаюць Федзя і Жэня. У руках Федзі вялікі мяшок. Спыніліся ля хвойкі...

ФЕДЗЯ. Вось тут. Лепшага месца і не знойдзеш...

ЖЭНЯ. Там вартавы...

ФЕДЗЯ. Я на мост не палезу... Адыходзіць будзем вунь туды...

ЖЭНЯ. Там жа балота.

ФЕДЗЯ. Есць сцяжынка.

ЖЭНЯ. Вартавы пайшоў.

ФЕДЗЯ. І я пайшоў *(вымае з мяшка міну, паўзе да моста, знікае)*.

ЖЭНЯ. Асцярожней...

Зноў паявіўся цень вартавога... Патупаў на адным месцы, знік... І цішыня... Не зводзячы вачэй, глядзіць Жэня ў бок, куды пайшоў Федзя.

Ну што ён там так доўга... Хутчэй, хутчэй, мілы...

Зноў паявіўся цень вартавога.

Убягае Федзя, схапіў Жэню за руку...

Выбух...

Федзя і Жэня выбягаюць... І адразу ж, з боку вартаўнічай будкі—у бок Федзі і Жэні аўтаматныя чэргі...

Цемра...

Глухое балота. Чарот. З неба—рэдкі снег... З купіны на купіну, цягнучы за сабой на сваім кажушку Федзю, упаўзае Жэня.

Уладкавала яго. Прысела побач. Прасунула руку пад кашулю на сэрца яго.

Азіраецца. Прыслухоўваецца.

ЖЭНЯ. Адарваліся, адарваліся... У балота яны не сунуцца, але ж і не пойдуць адсюль. Будуць чакаць, пакуль мы самі да іх не выйдзем... Холадна як... *(Заўважыла сняжынкі.)* Снег... ой, нашто ты так рана... *(Зноў аглянулася.)* Як жа ж мне цябе выцягнуць адсюль? *(Асцярожна дастала руку, прыстроілася, каб пацягнуць юнака далей, паслізнулася, упала на яго. Той ад болю апрытомнеў, застагнаў.)* Ба-ліць...

ФЕДЗЯ. Дзе мы?

ЖЭНЯ. У балоце. Скрозь балота... і сцяжынкі няма, скончылася... Пайшла пад ваду...

ФЕДЗЯ. Фрыцы дзе?

ЖЭНЯ. Мы ад іх адарваліся, але...

ФЕДЗЯ. Што?

ЖЭНЯ. Яны акружылі балота...

ФЕДЗЯ. Снег?

ЖЭНЯ. Снег. Першы.

ФЕДЗЯ. І апошні...

ЖЭНЯ. Ты што?

ФЕДЗЯ. Табе холадна.

ЖЭНЯ. Не.

ФЕДЗЯ. Здымі з мяне куртку і накінь на сябе.

ЖЭНЯ. Я сказала...

ФЕДЗЯ. Я сказаў...

Жэня асцярожна здымае з юнака куртку, накідвае на сябе.

Гады... прашылі мне жывот... Прыўзнімі мяне.

Жэня прыўзнімае юнака, кладзе яго галаву сабе на калені.

Вось так, добра... і ўжо не так баліць. Толькі кроў усё цячэ, цячэ... і ва мне, і ва мне яе становіцца ўсё менш і менш... Чаму я цябе так дрэнна, цьмяна бачу?

ЖЭНЯ. Ты без акуляраў... Табе цяжка гаварыць. Маўчы... Я буду гаварыць, а ты маўчы... Толькі аб чым гаварыць?.. Ой, як здорава зайграў гэты Зайграеўскі мост... Пакуль яны новы навядуць, з тыдзень, эшалоны стаяць будуць.

ФЕДЗЯ. Ты... Ты не шкадуеш што... што звязалася з намі?..

ЖЭНЯ *(не адразу, ціха)*. Аб адным толькі шкадую.

ФЕДЗЯ. Аб чым?

ЖЭНЯ. Пазней... Як вырвемся адсюль... скажу...

ФЕДЗЯ. Я ўжо не вырвуся... Я... я ніколі не задумваўся, якімі будуць мае апошнія хвіліны... І вось яны — апошнія...

ЖЭНЯ. Не! Не... Я зараз пацягну цябе... Я з табой... Мы вырвемся...

ФЕДЗЯ. Адна... Адна пойдзеш...

ЖЭНЯ. Без цябе?

ФЕДЗЯ. Так. Пацалуй мяне...

Жэня цалуе Федзю. Той спрабуе яе абняць, але не можа...

У куртцы пісталет. Там яшчэ павінна быць некалькі патронаў... Прыстрэль мяне...

ЖЭНЯ. Не! *(Адступаючы.)* Ніколі!

ФЕДЗЯ. Хай гэта будзе тваёй апошняй ласкай... калі любіш...

ЖЭНЯ. Люблю! Я люблю цябе.

ФЕДЗЯ. Пашкадуй мяне. А сама ідзі, няхай па горла ў вадзе, ідзі. Вырвешся. Адна вырвешся. Ідзі...

Дзяўчына вымае з кішэні пісталет, узводзіць яго.

Дзякуй. Дзякуй...

Вялікая паўза.

Не зводзячы вачэй, глядзіць Жэня на Федзю. І шэптам...

ЖЭНЯ. Я... я люблю цябе...

Страляе... і зноў шэптам...

Холадна... як холадна... Так мы і засталіся... Як дзеці. Так і не сталі. І ўжо ніколі не станем дарослымі... ты мне мужам, а я жонкай... Холадна... Ва ўсім целе — толькі холад...

Страляе і падае побач з Федзем.

Часцей, гусцей пайшоў снег. Завыў вецер, і ўжо завіруха...

ПІСЬМЕННІКІ—ШКОЛЬНІКАМ

«Дарагім дзецям, непараўнаўча больш шчаслівым, чым іх дзяды і бацькі. Няхай гэта кніга нагадвае вам, што за лепшую будучыню, за светлыя ідэалы чалавецтва трэба змагацца кожны дзень, каб апраўдаць сваё чалавечае прызначэнне».

Такі надпіс зрабіў Фёдар Гладкоў на тытульным лісце сваёй кнігі «Аповесць пра дзяцінства», якую прыслаў школьнікам сяла Кувакіна Чувашскай АССР.

Кувакінскія аматары літаратуры больш як 15 гадоў вядуць перапіску з савецкімі пісьменнікамі і пісьменнікамі краін сацыялістычнага лагера. Многія літаратары прыслалі сюды свае кнігі з аўтографамі.

На паліцах школьнай бібліятэкі захоўваюцца некалькі сотняў кніг з аўтографамі пісьменнікаў: Аляксандра Твардоўскага, Леаніда Ляонава, Аляксандра Фадзеева, Мірзы Ібрагімава, Аляксея Суркова, Сцяпана Шчыпачова, Вольгі Берггольц, Самуіла Маршака, Назыма Хікмета, Максіма Танка... Есць кнігі, атрыманыя з Балгарыі, Чэхаславакіі, Румыніі і ГДР. Дзеці з вялікай радасцю чытаюць і перачытваюць словы тувінскага пісьменніка Салчака Тока на тытульным лісце кнігі «Слова арата», адрасаваныя кувакінскім школьнікам: «Пасылаю кніжку не таму, што чакаю якой-небудзь пахвалы ад вас. Калі мая кніжка будзе карысная для вас, дык я буду вельмі рады, таму што для кожнага пісьменніка, хоць і маленькага, няма большай узнагароды, чым водгук чытачоў. Карыстаючыся выпадкам, жадаю вашаму гуртку ўсялякіх поспехаў у творчых справах, а школьнікам, піянерам, камсамольцам — выдатнай і добрай вучобы і моцнай дысцыпліны».

А вось што піша лаўрэат Ленінскай прэміі Леанід Ляонаў:

«Жадаю вам поспехаў у вучобе, а ў літаратуры — упартай творчай волі. Памятайце, без працы не бывае мастацтва, як і без таленту. Прывітанне вам, юныя сябры».

Беларускі паэт Пятрусь Броўка наказвае школьнікам вучыцца выдатна, заўсёды памятаць аб сваім вялікім народзе.

У школе ўсе любяць літаратуру, у гэтым вялікая заслуга кіраўніка літаратурнага гуртка, настаўніка Мікалая Мусорына. Пад яго кіраўніцтвам школьнікі часта наладжваюць літаратурныя вечары, віктарыны, дыспуты, у дадатак да ўрокаў вывучаюць творчасць пісьменнікаў, рыхтуюць для класных занняткаў альбомы аб выдатных творах літаратуры і іх аўтарах.

Пётр СЫМКІН,
нарэспандэнт АДН.

Куток калекцыянера

ЮБІЛЕЙ КАМСАМОЛА

У гонар 50-гадовага юбілею Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі, які будзе адзначацца сёлета 29 кастрычніка, Міністэрства сувязі СССР выпусціла серыю паштовых марак і памятны паштовы блок.

На мініяцюры вартасцю ў 2 капейкі адлюстраваны ўдзел камсамола ў грамадзянскай вайне, атака чырвонай конніцы. На пярэднім плане—камсамольскі баец у будзёнаўцы. На плашчы маркі—ордэн Чырвонага Сцяга, якім быў узнагароджаны камсамол за актыўны ўдзел у абароне Сацыялістычнай Бацькаўшчыны ад белагвардзейцаў і інтэрвентаў.

Удзелу камсамола ў будаўніцтве першых пяцігодак прысвечана трохкапеечная паштовая мініяцюра. На фоне Дняпрагэса імя Леніна ў час будаўніцтва намаляваны постаці юнака і дзяўчыны, якія вязуць бетон. На плашчы—ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ім узнагароджаны камсамол за працоўныя подзвігі, за ініцыятыву, праяўленую ў арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Удзел камсамола ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.—такая тэма чатырохкапеечнай мініяцюры з намаляваным на плашчы ордэнам Леніна. Гэта высокая ўзнагарода камсамолу за гераізм на франтах, у партызанскіх атрадах, падпольных антыфашысцкіх арганізацыях.

Другі ордэн Леніна—на шасцікапеечнай мініяцюры, малюнак якой паказвае ўдзел камсамольцаў у пасляваенным адбудаўленні народнай гаспадаркі. Гэта ўзнагарода ўручана Ленінскаму камсамолу ў 1948 годзе.

Апошняя марка серыі (вартасцю ў 10 капеек) паказвае ўдзел камсамола ў асваенні цалінных і залежных земляў. На плашчы—трэці ордэн Леніна, уручаны камсамолу ў 1956 годзе за подзвігі на цаліне.

Усе маркі—шматкаляровыя, выкананы афсетным спосабам. Зубцоўка—грабеньчатая. Памеры па перфарацыі 52 на 25 міліметраў. Нумары па каталозе з 3696 па 3700. Аўтары малюнкаў—мастакі ЛЕСЯГРЫ (Барыс Лебедзеў, Леанард Сяргееў і Марк Грынберг). Па іх малюнку выкананы і памятны паштовы блок «50 гадоў ВЛКСМ». На ім паўтораны малюнак паштовай маркі, прысвечанай удзелу камсамола ў грамадзянскай вайне, і ганаровы знак ВЛКСМ. Блок мае лакавае пакрыццё. Яго колеры—чырвоны, сіні і жоўты. Памер 100 на 77 міліметраў, намінал—50 капеек. Нумар па каталозе—3701.

А. МАРКУС
(АДН).

Госці МІНСКА

ВОЛЬГА, ВАЛЯ, ЖЭНЯ

Вольга, Валянціна і Яўгенія Шмялёвы.

Мы добра памятаем вясёлую кінакамедыю «Карнавальная ноч». Запомнілася музыка да фільма кампазітара А. Лепіна. І, вядома ж, не забылі мы лірычную жартоўную «Танечку», якую выконвалі тры афіцыянткі.

Гэта было вакальнае трыо сясцёр Шмялёвых: Валя, Жэня, Вольга.

Масква. 1954 год. Асенні вечар. Новенькая, з пахам свежай фарбы зала Тэатра эстрады. З гэтага незабыўнага канцэрта, прысвечанага адкрыццю Тэатра эстрады, і пачалося новае жыццё сясцёр Шмялёвых. Яны сталі прафесіянальнымі спявачкамі.

З усіх калектываў «братоў» і «сясцёр», на нашай эстрадзе, мусіць, толькі Шмялёвы — сапраўдныя сёстры.

— З песняй мы дружым змалку, — гаворыць Вольга. — Бацька і маці любілі песню. Навучылі і нас разумець музыку. Яна згуртавала нас, здружыла. Мы хочам, каб з эстрады гучала як мага больш старадаўніх народных песень—яны вельмі меладычныя і прыгожыя. Спяваем, вядома, і сучасныя.

Гэтымі днямі ў сталіцы Беларусі прайшлі канцэрты сясцёр Шмялёвых з удзелам інструментальнага ансамбля «Мелодыя» пад кіраўніцтвам музыканта і кампазітара Барыса Пятрова, чые песні таксама гучаць у праграме.

Выступаючы ў першым аддзяленні як салісткі, Валянціна і Вольга Шмялёвы прадэманстравалі цудоўныя вакальныя дадзеныя. Іх песні — то глыбока задумлівыя і працяжныя, то па хвацку свавольныя — вельмі спадабаліся слухачам.

Аб кожным нумары сясцёр Шмялёвых можна гаварыць паасобку. Але асабліва хочацца адзначыць народную песню на словы Сяргея Ясеніна «Клён ты мой апалы» ў апрацоўцы для квартэта (у гэтай песні трыо падпявае гітарыст Валерый Шмялёў). У ёй сумуючая, мітуслівая, пяшчотная душа паэта. Усё настолькі ясенінскае, што бачыш старую рускую вёску, вольныя лугі і адзінокае застылае дрэўца...

Прастата, чысціня інтанацыі, прыемны тэмбр, адсутнасць афектацыі і, вядома, удалы, шмялёўскі рэпертуар — вось што прыносіць сёстрам Шмялёвым заслужаны поспех.

А. ВАЙНШТЭЙН.
Фота аўтара.

ЦІ ВЫПІСАНА Ў ВАС НА НАСТУПНЫ ГОД ГАЗЕТА

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»?

З 1-га ВЕРАСНЯ ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ПАЎСЮДНА

ПАСТАРАЙЦЕСЯ АФОРМІЦЬ ЯЕ СВОЕЧАСОВА

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 верасня

Першая праграма 9-30 — тэлебачанне — школе. Фізіка. 9-ы клас. «Свабоднае падзенне». 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — опера М. Каваля «Апошні кацер». Тэлевізійны спектакль (М). 11-15 — «Табе, юнацтва!» Да 50-годдзя ВЛКСМ. «Назавіце сваіх герояў». Трансляцыя на Маскву. 11-45 — «Фізкультура і спорт» (М). 17-00 — «Навіны». 17-10—праграма перадач. 17-15 — «Пад Варонежам у нас». Перадача з Варонежа. 17-45—фестываль дакументальных фільмаў, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Сведкі вечнасці». 17-55 — для малодшых школьнікаў. «Вуліца ў кватэры». 18-25 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Заўтра нашай рэспублікі». Выступленне міністра мясцовай прамысловасці Г. У. Семяніхіна. 18-50 — дзіцячы экран. «Маўглі». «Карова на месяцы». Мультыплікацыйныя фільмы. 19-20 — «Навіны». 19-30 — першынство СССР па футболу. «Спартак» (Масква) — «Нефтчы» (Баку) (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-45 — «Гэта песні твае, камсамол!» (М). 22-00 — «Даліна сямі месяцаў». Мастацкі фільм. 23-15 — «Тольні факты». Праграма перадач. 23-25—для студэнтаў вну. «Тэхналогія металаў».

Другая праграма 17-45 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Расказы аб прыродзе». Перадача з Ленінграда». 18-15 — «Стандартызацыя і прагрэс» (М). 18-45 — «На музычнай хвалі». Перадача з Ленінграда. 19-30 — рэклама, аб'явы. 19-50 — «Салдаты Айчыны». Дакументальны фільм. Першая і другая серыі. 22-00 — А. Мраўлішвілі «Лёс паэта». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Тбілісі.

25 верасня

Першая праграма 9.30 — тэлебачанне — школе. 10-ы клас. «Барацьба за існаванне і прыродны адбор». 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — канцэрт лаўрэатаў Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва (М). 11-15 — «Табе, юнацтва!» Перадача з Львова. 11-45 — «Я малюю свет». «У казачным лесе». Тэлевізійныя фільмы для дзяцей (М). 12-15 — «Як пасварыліся Іван Іванавіч з Іванам Нікіфаравічам». Мастацкі фільм (М). 15-25 — праграма перадач. 15-30 — школьная фільматэка. «На дне». Фільм-спектакль. Першая серыя. 17-05 — «Навіны». 17-15 — «Да стартаў у Мехіка». Спартыўны агляд. 17-45 —на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР. Н. Гілевіч. «Перазовы». 18-15 — «У краіне Ціля Уленшпігеля». Да дзён бельгійскай культуры ў Маскве (М). 18-45 — за фасадам «свабоднага свету». «Новая ўсходняя палітыка Бона». Выступленне каментатара А. Ясінскага. 19-00 — першынство СССР па хакеі. ЦСКА—«Дынама» (М). У перапынку—навіны. 21-15—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 22-00 — праграма каляровага тэлебачання. «Кухарка». Мастацкі фільм (М). 23-30 — «Тольні факты». Праграма перадач. 23-40—для студэнтаў вну. «Фізіка». III курс.

Другая праграма 17-05 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — Грузінскія эстрадныя мелодыі. Перадача з Тбілісі. 18-00 — «Піянерыя». Кіначасопіс (М). 18-15—«Поступ часу». Кінанарыс. 18.45 — «Старонкі музычнага календара» (М). 19-00 — «Салдаты Айчыны». Дакументальны фільм. Трэцяя і чацвёртая серыі. 21-05—рэклама, аб'явы. 21-15 — «Яўгеній Анегін». Мастацкі фільм.

26 верасня

Першая праграма 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — «Інвалід». «Стрэлачнік». Тэлевізійныя пастаноўкі. 18-15 — «Дзённік пяцігодкі». 18-45 — «Навіны». 19-00 — першынство СССР па хакеі. «Лакаматыў» (Масква)—«Спартак» (Масква). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 21-15 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-45 — «Навуковую арганізацыю працы — у сельскую гаспадарку». Радыё-тэлевізійны лекторый. «Кіраўніцкія кадры. Падбор, расстаноўка, выхаванне». 22-15 — фестываль фільмаў, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ. «Алёшкава каханне» (М). 23-30 — «Тольні факты». Праграма перадач. 23-40—для студэнтаў вну. «Фізіка. III курс.

Другая праграма (Праграма раніцніх перадач трансліруецца на рэспубліку па 1-й праграме).

10.05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — фестываль фільмаў, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ. «За ўладу Саветаў!» (М). 11-50 — «Фізкультура і спорт» (М). 12-20 — літаратурны тэатр. Антуан дэ Сент Экзюперы. «Маленькі прынц». Частка першая (М). 13-05 — першынство СССР па хакеі. ЦСКА—«Дынама» (у запісе) (М). 16-50 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — «Табе, юнацтва!» (М). 17-30 — «Дарогу глыбінным рэзервам». Перадача з Данецка. 18-00 — з форуму пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі. Вядзе перадачу А. Суркоў. Трансляцыя з Ташкента. 20-10 — «Ленінградская сімфонія». Мастацкі фільм. 21-45—«Пад Варонежам у нас». Перадача з Варонежа.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ
імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

Аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

кафедра фартэпіяна—старшы выкладчык—1;
кафедра агульнага фартэпіяна—выкладчыкі — 4;
кафедра камернага ансамбля—старшы выкладчык—1;

Заявы і дакументы, згодна з палажэннем аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара, па адрасу: г. Мінск, Інтэрнацыянальная, 30.

Тэрмін падачы заяў—адзін месяц з дня апублікавання.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 02382